КУЛЬТУРА ▸ ГРАМАДСТВА ▸ ЭКАНОМІКА ▸
ЛЮДЗІ ▸ ПАДЗЕІ ▸ ФАКТЫ

◂ №44 (128)
◂ 19 СНЕЖНЯ ◂ 2008 г.

# Новы Час



**АЛЕГ ВОЛЧАК: ПРАВААБАРОНЦА — НЕ ПРАФЕСІЯ, А ПРЫЗВАННЕ**

Стар. 6

**СУСВЕТНЫ ФІНАНСАВЫ КРЫЗІС: КАТАЛІЗАТАР БЕЛАРУСКІХ РЭФОРМАЎ?**

Стар. 4–5

**СВЯТАРЫ, ЯКІЯ СПЯВАЮЦЬ**

Слова «святар» звычайна выклікае ў свядомасці асацыяцыі з сумнымі царкоўнікамі, што чытаюць біблейскія тэксты або моляцца. Час забыць пра старыя клішэ...

Стар. 13

**СВЯТА ПЯТРА І ПАЎЛАЎ**

Надышоў час пазвальняць усіх беларускіх літаратараў за профнепрыдатнасць. Самыя гучныя кнігі пачатку зімы выдалі палітыкі...

Стар. 15

**ЧЫТАЙЦЕ Ў НАСТУПНЫМ НУМАРЫ**

**«МІХАІЛ БАБРОЎСКІ: ВЯРТАННЕ МІНУЎШЧЫНЫ»**

Партрэт выбітнага беларускага навукоўца XIX стагоддзя, тэарэтыка беларускага адраджэння ў нарысе Яўгена Глінскага

▸ АД РЭДАКТАРА

# АКТУАЛЬНЫЯ ПАРАЛЕЛІ

*Аляксей КАРОЛЬ*

**Я стаяў у Доме Саюза цесляроў, што ў Філадэльфіі, перад сцягамі 12 «першапачатковых» калоній, якія і сталіся першымі Злучанымі Штатамі Амерыкі. Слухаў расповед валанцёра-экскурсавода пра падзеі таго далёкага часу, а думка мая дзіўным чынам праецыравалася на Беларусь і спараджала нечаканыя асацыяцыі і паралелі. Пра гістарычныя выклікі і мажлівасці дзвюх краін — Амерыкі і Беларусі. Здзейсненых там — напрыканцы XVIII стагоддзя і ўсё яшчэ актуальных тут — напачатку XXI. Дэмакратыя ці манархія? Самастойная незалежная дзяржава ці калонія? Нацыя ці насельніцтва?**




Мяне ўразілі не столькі сугучнасць агульных тэндэнцый, а супадзенні-разыходжанні ў канкрэтыцы, у дэталях падзей, у паводзінах і ўчынках людзей.

5 верасня — 26 кастрычніка 1774 года адбыўся Першы кантынентальны кангрэс. У толькі што ўзведзеным прафесійнай карпарацыяй цесляроў будынку сабраліся дэлегаты ад 12 штатаў «для абмеркавання і вызначэння шырокіх і адпаведных дзеянняў» па шматлікіх скаргах супраць Вялікабрытаніі. Не дзеля канфрантацыі, а для «аднаўлення саюза і гармоніі... з усім імпэтам, пажаданым для большасці добрых людзей».

Першы Кангрэс, як першае выпрабаванне на здольнасць эліты — яшчэ не нацыянальнай, яшчэ не краіны, але ўжо ўсведамляючай сябе ў якасці прадстаўнікоў пэўнай супольнасці, — знайсці адэкватны адказ на выклікі часу.

Можа, найбольш выбітная рыса працэсу кансалідацыі амерыканскай эліты — адкрытасць і адсутнасць здрады ва ўзаемадачыненнях. Ніхто нікога не «здаў» і не «кінуў», нікога не ўдалося перакупіць, запалохаць, зламаць шантажам, а потым ужо з капітулянтаў, палахліўцаў і перабежчыкаў стварыць паслухмяны квазіпарламент. Апазіцыйная каланіяльным уладам эліта здолела аб'яднацца, выпрацаваць і рэалізаваць цэласную канцэпцыю «Злучаныя Штаты Амерыкі». Крок за крокам, аператыўна рэагуючы на змены ў сітуацыі.

Ад удзелу ў Кангрэсе ўхілілася Джорджыя — яна крыху пазней усё ж далучыцца, але не настолькі позна, каб выпасці з агульнага працэсу і, галоўнае, каб гэтаму працэсу непапраўна пашкодзіць. І таму сцягоў у музеі 12, а першых штатаў-заснавальнікаў у гісторыі ЗША — 13.

Бізнес-эліта — прафесійны Саюз цесляроў, а па сутнасці ўсіх будаўнікоў Пенсільваніі, не збаяўся даць сваё памяшканне для напаўлегальнага Кангрэсу. Іх дом найлепшым чынам падыходзіў для сакрэтных сустрэч, хаваючы дэлегатаў ад наглядальнага вока кансерватыўнага каланіяльнага ўрада Пенсільваніі. Але ж і ўрад той, сфармаваны з тых жа самых каланістаў, не мог парушыць святое і для іх права прыватнай уласнасці. Амаральны стандарт — «было ваша стала наша» — для яго быў не тое што невядомы, але непрымальны. Непрымальны ён і для сучаснай Амерыкі.

Гармоніі з метраполіяй, аднак, не атрымалася. Тагачасны кароль Брытаніі Георг III на шматлікія скаргі каланістаў не рэагаваў, паліттэхналогіяй абяцанак не валодаў. Эканамічны ціск на калоніі Новага Свету працягваўся. Каланістаў абразілі адносіны да іх як да людзей другога гатунку.

Эканамічны па вытоках канфлікт перайшоў у палітычны. Свабода і гонар (правы чалавека) — найвышэй. І менавіта на тым Кангрэсе прагучалі знакамітыя словы дэлегата Патрыка Генры: «Я не віргінец — я амерыканец». Так быў сфармуляваны, поруч з прынцыпам Свабоды, другі фундаментальны прынцып, які аб'яднаў перасяленцаў з усяго свету і на якім паўстала і да гэтага часу грунтуецца дзяржава — Злучаныя Штаты Амерыкі. А ў міжнародную практыку быў уведзены прынцып нацыянальнай самаідэнтыфікацыі — не па этнічнай, а па дзяржаўнай прыкмеце.

Ці не найлепшы, хаця і з іншых гістарычных абставін, прынцып для сучаснай Беларусі. Скажам, у такой рэдакцыі: "Я рускі (паляк, габрэй...), але я — беларус!" А ў сукупнасці: «Мы — народ Беларусі, мы — дзяржава Беларусь, з даўнімі, з глыбінь тысячагоддзяў каранямі, і разам з тым мы — маладая нацыя, маладая краіна, незалежнасць і суверэнітэт якой яшчэ трэба сцвердзіць». І не ў канфрантацыі з усім сусветам, а на шляху ў Еўропу.

На тым жа Кангрэсе быў абазначаны і трэці прынцып — дэмакратыя. Аднак выніковы дакумент аказаўся кампрамісным і размытым да непрыдатнасці на практыцы. Спатрэбіўся другі Кангрэс, на які дэлегацыі ад штатаў ехалі з адным суровым запаветам: не разыходзіцца і не вяртацца, пакуль не будзе дасягнута адзінства і прыняты адпаведны дакумент.

Сёння ён вядомы як знакамітая Дэкларацыя незалежнасці, што і дала адказ на трэцяе пытанне: «Манархія ці дэмакратычная рэспубліка?». На рукапісе Джэферсана адбіткам жорсткіх спрэчак — мноства правак. Але адназначны выбар на карысць рэспублікі.

Не архітэктары ЗША вынайшлі ідэі свабоды, незалежнасці, дэмакратыі, падзелу ўладаў, а філосафы Францыі. Але менавіта айцы-заснавальнікі ЗША на грунце і ў развіццё гэтых ідэй упершыню стварылі на практыцы мадэль дзяржавы, якая аказалася на дзіва ўстойлівай і разам з тым дынамічнай, чуллівай на выклікі да перамен.

Працяг на стар. 3 ▸

# ФАКТЫ, ПАДЗЕІ, ЛЮДЗІ



## НАВІНЫ РЭГІЁНАЎ

### ГОМЕЛЬ

**Гомельскі аблвыканкам абвясціў конкурс на стварэнне гімна вобласці. Акцыя прымеркавана да 90-годдзя ўтварэння Гомельскага павета.**

Да 18 сакавіка 2009 года свае тэксты (абавязкова на беларускай мове) і ноты могуць дасылаць ва ўпраўленне культуры аблвыканкама жыхары не толькі Гомельшчыны, але і іншых рэгіёнаў краіны.

Як паведамілі ў прэс-службе аблвыканкама, да 31 сакавіка наступнага года лепшыя тэкст і музыку вызначыць камісія, прадстаўленая вядомымі музыкантамі, паэтамі і грамадскімі дзеячамі. Аўтарам-пераможцам абяцана грашовае ўзнагароджанне.

Творы павінны ўтрымліваць ідэю непаўторнай значнасці мінулага і сучаснага вобласці, распавядаць пра гістарычныя і духоўныя каштоўнасці народа, адлюстроўваць адданасць Айчыне, імкненне да ідэалаў гуманізму, міру і справядлівасці, мець глыбіню раскрыцця тэмы. Таксама важным крытэрыем ацэнкі будзе высокі мастацкі ўзровень, урачыстасць, запамінальнасць, характар музыкі-гімна.

### БРЭСТ

**З 8 па 12 студзеня 2009 года ў Брэсце пройдзе XXI Міжнародны фестываль класічнай музыкі «Студзеньскія музычныя вечары».**

У фестывалі возьмуць удзел музыканты і вакалісты з 17 краін, у тым ліку Аўстрыі, Беларусі, Італіі, Кітая, Літвы, Польшчы, Расіі, Украіны. Упершыню на музычны форум прыедуць прадстаўнікі Алжыра, Балгарыі, Бразіліі, Грузіі, Фінляндыі і Паўднёвай Карэі. Пра гэта паведаміла на прэс-канферэнцыі 16 снежня дырэктар фестывалю старшыня абласнога грамадскага аб'яднання «Брэсцкае музычнае таварыства» Лілія Батырава.

У межах фестывалю будзе прэзентаваны адзін з самых папулярных праектаў фонду Ірыны Архіпавай «Уладзіслаў П'яўка і кампанія. Парад тэнараў» (Расія), запланавана выступленне ўдзельнікаў прэстыжнага польскага фестывалю «Бельканта–2008», дуэта гітарыстаў Сесілія Сіквейра/Фернанда Ліма з Бразіліі, скрыпача Юлія Малаха (Аўстрыя), трох камерных аркестраў — са Львова (Украіна) і двух з Беларусі. Упершыню на фестывалі прагучаць бандура і банданеон.

Усяго ўдзельнікамі фестывалю стануць больш за 200 музыкантаў і вакалістаў. Арганізатары фестывалю — Брэсцкі аблвыканкам і Брэсцкі гарвыканкам, якія ў асноўным фінансуюць гэтае мерапрыемства, Міністэрства культуры Беларусі, Беларускі саюз музычных дзеячаў і Брэсцкае абласное музычнае таварыства.

### ГРОДНА



**16 снежня ў Гродне ў офісе гарадской арганізацыі грамадскага аб'яднання «Таварыства беларускай школы» адкрылася выстава паштовак «Насустрач Калядам».**

Як паведаміў каардынатар выставы Эдуард Дмухоўскі, яна арганізавана мясцовымі дэмакратычнымі актывістамі. На выставе дэманструецца больш за сто калядных паштовак.

Найстарэйшыя з экспанатаў датуюцца пачаткам XX стагоддзя. Паштоўкі адлюстроўваць не толькі жыццё гродзенцаў у розныя гістарычныя перыяды, але і змену ўладаў, якія панавалі на гарадзенскіх землях. Таму ў экспазіцыі можна пабачыць паштоўкі на польскай, беларускай, рускай і нямецкай мовах.

Адмыслова да адкрыцця выставы «Насустрач Калядам» надрукавана калядная паштоўка з выявай Каложскай царквы — помніка Гродзенскай школы дойлідства XII стагоддзя, намаляваная ў 1959 годзе Івонкай Сурвілай, сённяшнім прэзідэнтам Рады БНР.

### МАГІЛЁЎ

**Гарадскія ўлады Магілёва не дазволілі жыхарам мікрараёна Саломінка правесці мясцовы рэферэндум па пытанні зносу міні-рынку «Крыніца».**

Пра гэта паведаміў старшыня ініцыятыўнай групы па правядзенні рэферэндуму Ігар Каваленка.

Нагадаем, на месцы міні-рынку, які знаходзіцца ў адным з самых вялікіх спальных раёнаў Магілёва, хочуць пабудаваць Палац гімнастыкі. Сам рынак улады маюць намер перанесці ў аддаленую і нязручную, на думку жыхароў, частку раёна. Гараджане прынялі рашэнне падаць заяўку на правядзенне мясцовага рэферэндуму Ленінскага раёна Магілёва аб захаванні міні-рынку на ранейшым месцы. 14 лістапада ініцыятыўная група падала ўсе дакументы, неабходныя для правядзення рэферэндуму, у Магілёўскі гарвыканкам. У сваю чаргу, гарвыканкам накіраваў гэтыя дакументы ў абласное ўпраўленне юстыцыі для экспертызы.

13 снежня з гарвыканкама быў атрыманы адказ. У ім, у прыватнасці, гаворыцца, што гарадскія ўлады вырашылі адмовіць у правядзенні рэферэндуму, паколькі гарвыканкамам прынята рашэнне будаваць спартыўны комплекс.

**Паводле БелаПАН**

---

▸ АКЦЫЯ

## САЛІДАРНАСЦЬ З СЕМ'ЯМІ ЗНІКЛЫХ

**Акцыі салідарнасці з сем'ямі зніклых людзей прайшлі 16 снежня ў розных раёнах Мінска.**

На Кастрычніцкай плошчы ў 18 гадзін сямёра сябраў аргкамітэта па стварэнні руху «Маладая Беларусь» сталі з партрэтамі палітыка Юрыя Захаранкі (знік у маі 1999 года) і журналіста Дзмітрыя Завадскага (знік у ліпені 2000 года). Праз некалькі хвілін яны былі выцесненыя з плошчы супрацоўнікамі міліцыі ў цывільным за Палац Рэспублікі, а затым да перакрыжавання вуліц Янкі Купалы і Інтэрнацыянальнай.

Увесь гэты час удзельнікі ішлі з партрэтамі зніклых. Акцыя завяршылася без затрыманняў.

У гэты ж час 25 прадстаўнікоў зарэгістраванай у Чэхіі арганізацыі «Малады фронт» сталі з партрэтамі зніклых Віктара Ганчара, Анатоля Красоўскага (зніклі ў верасні 1999 года), Ю. Захаранкі і Д. Завадскага каля кінатэатра «Беларусь». Партрэты віселі таксама на агароджы ўздоўж вуліцы Гарадскі Вал разам з гірляндай у выглядзе надпісу «Мы памятаем». Затым маладыя людзі прыйшлі да кінатэатра «Масква», дзе сталі з партрэтамі, запаленымі свечкамі і расцяжкай «Патрабуем міжнароднага расследавання выкраданняў лідэраў апазіцыі». Супрацоўнікі праваахоўных органаў на акцыі не прысутнічалі.

У 16 гадзін гэткая ж акцыя салідарнасці прайшла на плошчы Якуба Коласа. За распаўсюджанне ўлётак з інфармацыяй пра зніклых быў затрыманы актывіст грамадзянскай кампаніі «Еўрапейская Беларусь» Юрый Пляшкоў. Ён быў адпушчаны праз дзве гадзіны без складання пратакола.

У 14 гадзін у студэнцкім гарадку БДУ падчас раздачы студэнтам улётак аб зніклых беларускіх палітыках былі затрыманыя актывісты аргкамітэта па стварэнні руху «Маладая Беларусь» Артур Фінькевіч, Алесь Сцепаненка, Валерый Саковіч, Сяргей Кастыленка і Алег Кероль. Іх таксама адпусцілі без складання пратакола.

Дзень салідарнасці з сем'ямі зніклых палітыкаў і рэпрэсаванымі па палітычных матывах апазіцыя праводзіць 16-га чысла кожнага месяца, пачынаючы з кастрычніка 2005 года.

**Паводле БелаПАН**

---

▸ ПАТРАБАВАННЕ

## НЕ ВЫДАВАЦЬ ВІЗЫ ЧЫНОЎНІКАМ

**Палітыкі Нідэрландаў 15 снежня запатрабавалі ад урада краіны прыняць меры супраць беларускіх чыноўнікаў, у тым ліку прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі, у сувязі з тым, што яны чыняць перашкоды паездцы дзяцей з пацярпелых ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС рэгіёнаў на калядныя канікулы за мяжу.**

Як паведамляе «РИА Новости», дэпутаты ад найбуйнейшай партыі кіруючай кааліцыі Нідэрландаў — Хрысціянска-дэмакратычны заклік (ХДП) — Пітэр Омтзіхт і Марцін Хаверкамп накіравалі ліст на імя міністра замежных спраў краіны Максіма Верхагена. У ім дэпутаты заявілі пра неабходнасць спыніць выдачу візаў прадстаўнікам беларускай улады і членам іх сем'яў. Пры гэтым сябры галандскага парламента заznačылі, што, чынячы перашкоды адпачынку за мяжой чарнобыльскіх дзяцей, беларускія чыноўнікі і члены іх сем'яў часта ездзяць за межы Беларусі, у прыватнасці на вучобу. На думку ХДП, забарону на выдачу візаў прадстаўнікам беларускіх уладаў і членам іх сем'яў неабходна аформіць у рамках Еўрапейскага саюза.

«Ужо больш за дваццаць гадоў тысячы дзяцей з пацярпелых ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС рэгіёнаў ездзілі на адпачынак у Нідэрланды. Яны жывуць у галандскіх сем'ях, і пра іх заўсёды добра клапоцяцца. Мы хочам, каб чарнобыльскія дзеці зноў атрымалі магчымасць праводзіць канікулы за мяжой. Жыхары многіх галандскіх гарадоў гатовы іх прыняць і падарыць ім цудоўныя калядныя канікулы», — сказаў Омтзіхт.

Нагадаем, упершыню пра забарону на выезд дзяцей за мяжу паведаміла 4 верасня 2008 года ірландская газета The Irish Times. Афіцыйныя прадстаўнікі Беларусі гэтыя звесткі не пацвярджалі, але заяўлялі аб неабходнасці падпісання двухбаковых пагадненняў з краінамі, што прымаюць беларускіх дзяцей на аздараўленне. У МЗС Беларусі БелаПАН адмовіліся паведаміць, ці адпраўлены праекты такіх пагадненняў усім зацікаўленым краінам.

13 кастрычніка Аляксандр Лукашэнка ўказам № 555 унёс змяненні і дапаўненні ва ўказ ад 18 лютага 2004 года № 98 «Аб арганізацыі аздараўлення дзяцей за мяжой, што ажыццяўляецца на аснове замежнай бязвыплатнай дапамогі». Згодна з дакументам, беларускія арганізацыі змогуць накіроўваць дзяцей на аздараўленне толькі ў тыя дзяржавы, з якімі Беларусь заключыла міжнародныя дагаворы, што прадугледжваюць дзяржгарантыі бяспечнага знаходжання дзяцей на аздараўленні ў гэтай краіне і іх своечасовае вяртанне ў рэспубліку.

---

▸ ФЭСТ

## СПЯШАЙЦЕСЯ РАБІЦЬ ДАБРО!

**Міжнародная арганізацыя «Малады фронт» (Чэхія) правядзе традыцыйны калядны фэст. Акцыя мае адбыцца 20 снежня ў памяшканні Управы БНФ а 15-й гадзіне.**

Як паведаміў БелаПАН кіраўнік арганізацыі Дзмітрый Дашкевіч, калядны фэст — гэта святочная імпрэза, падчас якой выступяць беларускія барды і рок-музыкі, а таксама дабрачынны кірмаш, дзе кожны зможа набыць сувеніры, упрыгажэнні, лялькі і цацкі. Усе сабраныя грошы маладафронтаўцы перададуць у дзіцячыя дамы.

«Каляды — час цуду, дабра і радасці. Прынясіце радасць і цяпло тым, каму яно так неабходна. Спяшайцеся рабіць дабро!» — заклікаў Дашкевіч.

---

▸ РЭГІСТРАЦЫЯ

## РУХ «ЗА СВАБОДУ» ЦЯПЕР ЛЕГАЛЬНЫ

**Вольга ХВОІН**

**Міністэрства юстыцыі Беларусі зарэгістравала рух «За Свабоду». Рэгістрацыйнае пасведчанне за нумарам 2020 прадстаўнікі аркамітэту па стварэнню руху атрымалі 17 снежня.**

Цяпер адзін з самых масавых грамадска-палітычных рухаў Беларусі пад кіраўніцтвам былога кандыдата на пасаду прэзідэнта Аляксандра Мілінкевіча называецца «Праваабарончa-асветніцкае грамадскае аб'яднанне Рух за Свабоду».

«Гэтае лагічнае рашэнне Мініста, паколькі, як мы лічым, ніякіх падстаў для нерэгістрацыі аб'яднання няма і не было падчас папярэдніх спроб зарэгістраваць рух, — заявіў прадстаўнік руху Юрась Губарэвіч. — Мы спадзяемся, што ўслед за рэгістрацыяй нашага руху Мінюст прыме аналагічныя рашэнні і ў дачыненні да іншых грамадскіх арганізацый, якія імкнуліся перайсці да легальнай формы дзейнасці».

Дакументы на рэгістрацыю руху да гэтага падаваліся тройчы. І кожны раз Міністэрства юстыцыі знаходзіла прычыны для адмовы. Відавочна, што рэгістрацыя руху «За Свабоду», як і вяртанне ў дзяржаўную сістэму распаўсюду двух апазіцыйных газет — крокі афіцыйнага Мінска па выкананню патрабаванняў Еўрасаюза аб дэмакратызацыі грамадства. Чакаем, што кіраўніцтва краіны на гэтым не спыніцца і дазволіць легальна працаваць іншым грамадскім аб'яднанням, верне ў падпіску і распаўсюд дзесяткі недзяржаўных выданняў. Дэмакратызацыя мусіць быць усеагульнай, а не кропкавай і «на паказ».

АД РЭДАКТАРА

# АКТУАЛЬНЫЯ ПАРАЛЕЛІ

**Працяг. Пачатак на стар. 1.**

Устойлівай настолькі, што ёй, ці не адзінай, не пагражае беспрацінны на працягу больш за дзвесце гадоў прыток эмігрантаў з усяго свету — людзей розных поглядаў і веравызнанняў, прагматыкаў і рамантыкаў, вальнадумцаў і кансерватараў. Які гіганцкі маштаб, думаў я стоячы перад помнікам уцекачам у Нью-Йорку: мільёнам людзей гэта краіна не проста падаравала выратаванне, але і адкрыла ўсе магчымасці для самарэалізацыі, аж да прэзідэнта ўключна. Прыток, які не разбурае, а, наадварот, сілкуе жыццядзейнасць краіны, дзе кожны перасяленец амаль імгненна становіцца і адчувае сябе амерыканцам, не забываючыся аб сваёй этнічнай тоеснасці.

Ужо ў другім горадзе — Сан-Антоніа (штат Тэхас), які сваёй гісторыяй, архітэктурай і пераважна іспанскай мовай на вуліцах дэманструе іспанскі пачатак ЗША, у якім больш за палову жыхароў — выхадцы з Мексікі, я пачуў жартаўлівае меркаванне: «Бачыце, праз дзесяцігоддзі адбылася мірная рэінкарнацыя горада і штата». Але ўсе тэхасцы лічаць сябе амерыканцамі, а свой штат — неад'емнай часткай, апорай Амерыкі.

І як жа бракуе беларусам, асабліва з апошняй хвалі эмігрантаў, адчування менавіта гэтай тоеснасці са сваёй першай радзімай, падумалася мне ў музеі Тадэвуша Касцюшкі, што ў Філадэльфіі. Як бракуе яе і беларусам у Беларусі. Бо тым, што не адчуваеш сваім кроўным, не даражыш. Адсюль і млявая рэакцыя беларускай эліты на лёсавызначальныя выклікі часу, на неабходнасць перамен.

Рэакцыя амерыканскай эліты (і шырэй — усёй амерыканскай супольнасці) з часам не толькі не аслабла, а, наадварот, абвастрылася. Яна ёсць па сутнасці рэакцыяй на апераджэнне пагрозы. Калі не на дальніх подступах, то хаця б за крок ад непапраўнай бяды, ад катастрофы.

Я трапіў у ЗША літаральна на наступны дзень пасля прэзідэнцкіх выбараў і мог адчуць гістарычную сугучнасць гэтай здольнасці Амерыкі да перамен. Амерыкі Вашынгтона і Амерыкі Абамы. Айцы-заснавальнікі ЗША далі ў рукі грамадзян інструмент, які эфектыўна працуе да гэтага часу. І якога пазбаўлены мы — гэта выбары. Абама — адказ амерыканцаў на вострае адчуванне неабходнасці перамен.

У сваёй прамове на цырымоніі ўручэння прэміі імя Найта Міжнародным цэнтрам журналістыкі ў Вашынгтоне, з нагоды якой мне і пашчасціла трапіць у Амерыку, зорка CNN Хрысціан Аманпур прамовіла: «У мяне ўзнікла ўражанне, што я прысутнічаю на выбарах у краіне, якая ўпершыню ладзіць дэмакратычныя выбары, настолькі вялікі быў энтузіязм людзей». Пра наспеласць перамен прамаўляў і другі вядучы цырымоніі — Джордж Стэфанопулас, былы прэс-сакратар прэзідэнта Клінтана, а сёння вядоўца адной з самых папулярных тэлепраграм ABC. Прэзідэнт жа фонду Найта, выдавец уплывовага выдання ў Маямі Альберта Ібарген, дастаў свой мабільнік і паказаў мне фота: «Гэта я ў чарзе на выбарчым участку. Паўтары гадзіны адстаяў».




Магчымасць уплываць на ход падзей і выбіраць патрабуе інфармаванасці. Амерыка глядзіць па тэлевізары палітычныя праграмы, чытае газеты, карыстаецца інтэрнэтам, слухае радыё. Яна ведае сваіх зорак журналістыкі, якія рэальна фармуюць грамадскую думку. Потым у размовах з шараговымі амерыканцамі на пабытавым узроўні мне не аднойчы даводзілася чуць: «О, Аманпур! О Стэфанопулас!»

Быў і зваротны, як не дзіўна, станоўчы па псіхалагічным змесце на сітуацыю ў Беларусі водгук. «Мы адчулі, — казалі мне амерыканскія журналісты, — якая дробязь нашы праблемы на фоне вашых, нашы журналісцкія цяжкасці ў параўнанні з вашымі. Ваша мужнасць дадае нам аптымізму. Але ж мы і пераканаліся, як цесна знітавана ў сучасным свеце вырашэнне нашых і вашых праблем».

...Імпульсы асацыятыўнай памяці злучаюць у непарыўную лінію асноўныя моманты амерыканскай гісторыі: ні адзін з іх, хаця і не без драматычных перападаў (грамадзянская вайна, расавая дыскрымінацыя), амерыканская эліта не прайграла. А беларуская? Ёсць адна бясспрэчная перамога, першасная, зыходная — незалежная, суверэнная Беларусь. Астатнія ж пакуль — усе на пройгрыш. Беларуская эліта не здолела аб'яднацца (да гэтага часу) і выпрацаваць канцэпцыю ды мадэль перамен. Прайграла першыя прэзідэнцкія выбары. Замест свайго Вашынгтона... Мела парламент і не ўтрымала яго. Паддаецца шантажу. Схільная да ўнутраных інтрыг.

Небяспека зноўку страціць знойдзеную на скрыжаваннях тысячагадовай гісторыі Беларусь, на жаль, з палітычнага небасхілу нікуды не знікла. Але разам з тым над даляглядам замільгацела і новая магчымасць альтэрнатывы. Не прайграць бы зноў.

ТЫДНЁВЫ АГЛЯД

# КРЫЗІС ЁСЦЬ!

Сяргей САЛАЎЁЎ

**Стандартныя заклінанні кіраўніка дзяржавы і ўрада Беларусі аб тым, што крызіс наш «сасуд» не закране, як кажуць, сканалі на каране. І падставы для гэта даў сам прэзідэнт.**

Падчас рабочага візіту ў Беразіно (Мінская вобласць) 16 снежня Аляксандр Лукашэнка, калі казаў пра праблемы, звязаныя з сусветным фінансавым крызісам, запатрабаваў не дапусціць павелічэння беспрацоўя ў краіне. Прэзідэнт «са шкадаваннем канстатаваў», што Беларусі не ўдасца застацца ўбаку ад крызісу, наступствы якога адбіваюцца, у першую чаргу, на скарачэнні продажу тавараў, зазначае прэс-служба. Таму галоўная задача для рэспублікі — рэалізаваць вырабленую прадукцыю, у сувязі з чым неабходна максімальна выкарыстаць усе магчымасці па збыце айчынных тавараў, падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

Лукашэнка зазначыў, што 2009–2010 гады будуць няпростымі. «Нам трэба перажыць гэтыя гады. З гэтага крызісу моцныя выйдуць яшчэ больш моцнымі, а слабыя прадпрыемствы мы падтрымаем, калі яны сапраўды хочуць працаваць і зарабляць», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Але нешта гэтага не бачна па дзейнасці ўрада. Інакш бы яны не пакідалі людзей без працы.

Менавіта за правы на працу на мінскія вуліцы выходзілі прадпрымальнікі. «Прадпрымальнікі сёння выйшлі на марш, таму што жадаюць працаваць спакойна», — заявіў лідэр РГА «Перспектыва» Анатоль Шумчанка, звяртаючыся да ўдзельнікаў Маршу прадпрымальнікаў, якія сабраліся каля будынка прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук у Мінску.

Адзінае пытанне — ці пачуе прэзідэнт прадпрымальнікаў? Шапікі на прыпынках у Мінску ж зніклі, нягледзячы на тое, што яны давалі і працу, і прыбытак гарадскім уладам у выглядзе падаткаў.

А тым часам Мінск працягвае гуляцца ў гульні з Еўропай. У другой палове студзеня ў Мінску пройдуць кансультацыі з БДІПЧ АБСЕ, што тычацца рэкамендацый гэтай міжнароднай структуры па змене беларускага выбарчага заканадаўства. Пра гэта паведаміла журналістам 17 снежня старшыня Цэнтрвыбаркама Лідзія Ярмошына. Яна ўдзельнічае ў арганізаваным Выканкамам СНД пасяджэнні «круглага стала», на якім абмяркоўваюцца пытанні павышэння эфектыўнасці дзейнасці місій назіральнікаў ад СНД у краінах Садружнасці. Паводле слоў Л. Ярмошынай, падчас кансультацый будуць закрануты пытанні правядзення выбарчых кампаній, а таксама ўзаемадзеяння бакоў.

Прэзідэнт Беларусі раней даручыў дзяржаўным органам прапрацаваць ва ўзаемадзеянні з БДІПЧ АБСЕ рэкамендацыі гэтай арганізацыі аб паляпшэнні беларускага выбарчага заканадаўства. Як зазначыла Л. Ярмошына, да гэтага працэсу акрамя Цэнтрвыбаркама будуць «актыўна падключаны» тыя структуры, якія працуюць з заканадаўствам. Паводле яе слоў, перш за ўсё гэта цэнтр заканадаўчай дзейнасці, парламенцкія структуры. «Мы збіраемся накіраваць для вывучэння заключэнне АБСЕ ўсім арганізацыям па выбарах на месцах, прынамсі, на абласным узроўні, каб потым абмеркаваць на «круглым стале» выбарчую кампанію як такую і рэкамендацыі АБСЕ. Прынамсі, дыялог пачнецца», — сказала Ярмошына.

Кіраўнік ЦВК не здолела адказаць на пытанне, якія з прапаноў АБСЕ могуць быць найбольш прымальнымі для беларускага боку. «Мы атрымалі рускі тэкст канчатковага дакумента толькі днямі і пакуль яго асэнсоўваем», — сказала яна.

Асэнсаванне можа цягнуцца доўга — ажно да таго моманту, пакуль не прыйдзе тэрмін часовага прыпынення акцый у адносінах да беларускіх чыноўнікаў наконт іх нявыезду ў краіны Еўрасаюза. Хаця, здаецца, спадарыня Ярмошына мела шмат часу асэнсаваць усё, што б ёй ні казалі. Бо казалі гэта не ў першы раз, а пасля кожнай выбарчай кампаніі.

А пакуль усе кажуць пра крызісы і недахоп грошай, вельмі аптымістычна выглядае наш атамны праект. Вось яго крызіс не закрануў дакладна. Работы па будаўніцтве атамнай электрастанцыі могуць распачацца на будучы дзень пасля падпісання акта аб выбары пляцоўкі. Пра гэта на прэс-канферэнцыі 17 снежня ў Мінску паведаміў інжынер дзяржустановы «Дырэкцыя будаўніцтва атамнай электрастанцыі» Уладзімір Петрушкевіч.

«Пасля таго, як будзе падпісаны акт выбару пляцоўкі, які, згодна з законам аб атамнай энергіі, зацвярджае кіраўнік дзяржавы, работы распачнуцца практычна адразу. Мы да іх ужо рыхтуемся дастаткова даўно», — сказаў ён. Паводле слоў У. Петрушкевіча, калі, напрыклад, 31 снежня пляцоўка для будаўніцтва АЭС будзе зацверджана, ужо 1 студзеня можна пачынаць стварэнне «піянернай будбазы, жылога пасёлку і транспартных камунікацый». «Гэта тыя першачарговыя мерапрыемствы, якія мы павінны выканаць, каб у далейшым працягваць работы на пляцоўцы», — зазначыў спецыяліст.

На прэс-канферэнцыі 4 снежня начальнік аддзела міжнароднага супрацоўніцтва дэпартамента па ядзернай энергетыцы Мінэнерга Лілія Дулінец паведаміла, што пасяджэнне дзяржаўнай камісіі па выбары месца размяшчэння зямельнага ўчастка для будаўніцтва АЭС адбудзецца 22–23 снежня.

Найбольш прыярытэтнай для будаўніцтва АЭС у Беларусі лічыцца Астравецкая пляцоўка (Гродзенская вобласць). Другой па прыярытэтнасці з'яўляецца Чырвонапалянская (Чавускі раён Магілёўскай вобласці), трэцяй — Кукшынаўская (Шклоўскі раён Магілёўскай вобласці).

АНАЛІЗ

# Сусветны фінансавы крызіс: КАТАЛІЗАТАР

Міхаіл ЗАЛЕСКІ

**Сусветны фінансавы крызіс адбыўся ў перыяд, калі пачаліся працэсы павольнай інтэрнацыяналізацыі беларускай эканомікі, уваходжання яе ў сусветныя фінансавыя рынкі. Ступень гэтай інтэграцыі даволі слабая, аднак чыннікі, праз якія пертурбацыі ў сусветнай эканоміцы адбіваюцца на Беларусі, зусім не падкантрольныя тым, хто прымае рашэнні ў Мінску. Гэта азначае, што беларускія ўлады і эканамічныя суб'екты не маюць іншага выйсця, акрамя адаптацыі. Беларускім уладам даводзіцца змірыцца з непазбежным: прымаючы пад увагу структурныя і палітычныя чыннікі, такія, напрыклад, як абавязальніцтвы дзяржавы перад грамадствам. Крызіс падштурхоўвае Беларусь да рэформаў, і ў першую чаргу да прыватызацыі. Пра гэта сведчыць і ідэалагічная апрацоўка насельніцтва, якую пачалі беларускія ўлады для легітымізацыі новай эканамічнай мадэлі.**

## Ці толькі вонкавы крызіс?

Мяккая грашовая палітыка, якую доўгія гады праводзілі ЗША, маючы на мэце забеспячэнне росту ўнутранага попыту і паскарэнне грашовага абароту, завяршылася пэўнымі праблемамі. Гэтыя турботы не закранулі Беларусь адразу і наўпрост, бо нашы фінансавыя дзівосы маюць іншае паходжанне: пашырэнне разрыву ў тэмпах росту крэдытаў, дэпазітаў і вытворчасці на фоне нарастання адмоўнага сальда ў гандлі таварамі з навакольным светам.

Аднак падмурак у розных працэсаў адзіны. Бо і ў Беларусі крэдытныя паводзіны грамадзян і суб'ектаў гаспадарання нарэшце уніфікаваліся з глабальнымі: таго, хто пазычае, больш не лічаць няшчасным, падазроным і ненадзейным. Жыць «у пазыку», у адрозненне ад папярэдніх часоў, у Беларусі стала нармальным. Але пры адсутнасці рынку каштоўных папераў кіраўнік краіны можа карыстацца рыторыкай, што характарызуе праблему крызісу як «знешнюю». Пры гэтым у статыстычных паведамленнях наш знешні гандаль улічваецца ў доларах ЗША. Да таго ж мы маем са знешнім светам агульную мяжу. І праз тую мяжу ў абодва бакі накіроўваюцца рэчы, грошы і інфармацыя. Так што называць крызіс «знешнім» у такіх варунках — гэта тое самае, што дыхаць паветрам і адначасова называць атмасферу «знешнім» чыннікам.

Зірнем на айчынны імпарт і экспарт. Яны, бясспрэчна, растуць цягам апошніх чатырнаццаці гадоў. Тым часам расце і прапускная здольнасць каналу, праз які прыходзяць да нас праблемы ад суседзяў. Адбываецца гэта ў выглядзе скарачэння спажывання нашай экспартнай прадукцыі або зніжэння цэнаў на тое, што мы імпартуем.

З табліцы 1 выразна бачна, як у сярэдзіне перыяду, не без уплыву крызісу 1997–1998 гадоў, адбылася радыкальная змена тэндэнцый: экспарт у Расію стаў меншы за «заходні», а імпарт з Расіі пачаў імкліва расці. Крыніцай пераўтварэнняў былі цэны на сырую нафту і ўгнаенні. Дзеля іх пастаяннага росту стала мяняцца таварная структура экспарту ў краіне і з'явіліся дадатковыя валютныя рэсурсы для вырашэння часткі ўнутраных праблемаў.

Рост валютнай выручкі (табліца 1), прыток наяўных рэсурсаў ад знешніх мігрантаў (сярэднегадавая іх колькасць — у пераліку на занятых поўны працоўны год — апошнія пяць гадоў вагалася каля 250 тысяч чалавек) і рост знешняй запазычанасці дазвалялі ўтрымліваць курс рубля адносна долара і паслядоўна нарошчваць золатавалютныя рэзервы Нацыянальнага банку. Знікненне вышэйназваных чыннікаў пацягне розныя наступствы. Таму асноўнае пытанне крызісу для Беларусі звязана з вызначэннем сумарнага вектару чакаемых змяненняў.

Пачнём з нафты і прадуктаў яе перапрацоўкі, калійных угнаенняў, натуральнага газу і двух апярэджваючых індыкатараў унутранага рынку: попыту на жытло, новыя аўтамабілі і камп'ютары (табл. 2).

Усе абраныя індыкатары дэманстравалі станоўчую дынаміку. Адзначым устойлівае спажыванне імпартаванай нафты на ўнутраным рынку і дасягненне максімуму ў спажыванні натуральнага газу. Прадукты перапрацоўкі нафты складаюць большую палову нашага экспарту. У выніку крызісу нафта робіцца ўсё больш таннай. Адбываецца скарачэнне цэнаў і аб'ём спажывання прадуктаў яе перапрацоўкі. Краіна будзе імпартаваць менш нафты і экспартаваць менш нафтапрадуктаў (тым часам Расіі будзе даставацца ўсё большая частка ад экспартных мытных збораў).

Ужо відавочна, што тут падзеі пачалі рухацца не на нашу карысць. Тое, што ўслед за нафтай патаннее і газ, палёгкі не прынясе, бо скарачэнне адмоўнага сальда ў знешнім гандлі будзе ісці адначасова са скарачэннем нашай канкурэнтаздольнасці. Гэта прама прапарцыйна розніцы паміж сярэдняй цаной газу ў Еўропе і льготнай цаной на мяжы Беларусі.

Эканамічны стан «Газпраму», які назапасіў каласальную знешнюю запазычанасць пад вартасць сваіх акцыяў, што за апошнія месяцы абясцэніліся ў разы, не абяцае нам далейшай палёгкі — больш таго, цалкам магчыма, што фінансавыя страты «Газпрам», як і іншыя карпарацыі, кампенсуе за кошт бліжэйшых суседзяў, у тым ліку і Беларусі. Раптоўна памяняць структуру паліўна-энергетычнага комплексу таксама не выпадае. Застаецца спадзявацца на захаванне плацежаздольнасці спажыўцоў калійных угнаенняў: Індыі, Кітаю, Бразіліі, ЗША і Польшчы. Аднак плацежаздольнасць гэтых спажыўцоў таксама залежыць ад таго, наколькі хутка сусветная эканоміка, і ў першую чаргу эканомікі ЗША і ЕС, ад экспарту ў якія залежыць і эканамічны рост у названых краінах, выкараскаецца з крызісу. Нарэшце, з-за крызісу пачалося скарачэнне працоўных месцаў ва ўсіх суседніх краінах.

У выніку, напрыклад, у сферы будаўніцтва ў Беларусі апошнім месяцам знік дэфіцыт кадраў. Прыток грошай ад мігрантаў запавольваецца. Што тычыцца так званай «аўтарытарнай мадэрнізацыі», то яна засталася фікцыяй розуму афіцыйнай прапаганды. Ва ўмовах крызісу пашырэнне збыту не вельмі канкурэнтаздольнай прадукцыі нашага машынабудаўнічага комплексу мае перспектыву толькі ў межах былога СССР па бартэрных схемах. Чаканы ў Расіі пуск аналагаў нашых прадпрыемстваў, якія там збудавалі па сучасных заходніх тэхналогіях, вельмі небяспечны для нашага рынку.

## Пастка спажывецкага грамадства

Тым часам насельніцтва ўступіла ў фазу масавага спажывання, пачало прызвычайвацца да росту якасці жыцця. Гэта спажыванне актыўна стымулявалася банкаўскім сектарам. Рынак крэдытавання апошнія шэсць гадоў імкліва рос. Асноўную масу карыстальнікаў склалі асобы ва ўзросце 20–50 гадоў, якія да сярэдзіны бягучага года назапашвалі больш за 10 трыльёнаў рублёў (прыкладна 9 працэнтаў ВУП 2007 года).

Адначасова расла запазычанасць ураду, камерцыйных банкаў і прадпрыемстваў. Пры вялікай долі апошніх у сукупнай запазычанасці небяспечнай ёсць кароткатэрміновасць абавязацельстваў у вытворчай сферы. Сукупная знешняя запазычанасць складае пад 15 мільярдаў долараў і працягвае расці. Прадэклараваныя намеры пазычыць у Расіі і МВФ яшчэ 4 мільярда долараў, што, дарэчы, адпавядае планаванаму адмоўнаму сальда знешнегандлёвых аперацыяў на канец года.

Варта зазначыць, што змяненне запазычанасці адбываецца паводле добра вядомых заканамернасцяў росту на базе дыскрэтных і абмежаваных рэсурсаў. Іншымі словамі, надышла фаза, калі працэс росту запазычанасці і яе вяртання нельга ўжо разглядаць як лінейны. Падлікі сведчаць, што пры існуючым тэмпе росту з канца наступнага года памер запазычанасці пачне цыклічна вагацца паміж двума ўзроўнямі 17–20 мільярдаў долараў, бо пазычаць нам будуць ужо толькі на рэструктурызацыю той запазычанасці. Далейшы імклівы рост абавязацельстваў істотна павялічвае імавернасць перарастання цыклічных ваганняў у хаатычныя.

Дзяржаўныя і недзяржаўныя заёмшчыкі рэгулююць рост сваіх абавязацельстваў і дысцыпліну разлікаў прапарцыйна прапанове грошай банкамі і адпаведна інфармацыі пра дынаміку тых ці іншых рынкаў. Тэрміновыя меры кіраўніцтва краіны часова




Цана сырой нафты за папярэднія: месяц, квартал, год, пяць гадоў




Таварная структура экспарту і імпарту у 2007 г. у адсотках да выніку




Крэдытаванне насельніцтва камэрцыйнымі банкамі

**ТАБЛІЦА 1.** АСНОЎНЫЯ ПАКАЗЧЫКІ ЗНЕШНЯГА ГАНДЛЮ, (МІЛЬЁНЫ ДОЛАРАЎ ЗША)

| Гады | 1995 | 2000 | 2005 | 2007 |
|---|---|---|---|---|
| **Экспарт тавараў** | **4 803** | **7 326** | **15 979** | **24 275** |
| у тым ліку: у Расію | 2 185 | 3 710 | 5716 | 8 879 |
| на Захад (ЕС і ЗША) | 1 776 | 2 927 | 8 919 | 13 054 |
| **Імпарт тавараў** | **5 564** | **8 646** | **16 708** | **28 693** |
| у тым ліку: з Расіі | 2 965 | 5 605 | 10 118 | 17 205 |
| з Захаду (ЕС і ЗША) | 1 887 | 2 576 | 5 566 | 9 677 |

Крыніца: Дзяржаўны статыстычны камітэт Рэспублікі Беларусь

**ТАБЛІЦА 2.** НЕКАТОРЫЯ ПАКАЗЧЫКІ ЭКСПАРТУ І ІМПАРТУ Ў НАТУРАЛЬНЫМ ВЫРАЖЭННІ

| Гады | 2000 | 2005 | 2007 |
|---|---|---|---|
| Імпарт сырой нафты, млн. т | 11,9 | 19,2 | 20 |
| Экспарт нафтапрадуктаў, млн. т | 7,8 | 13,5 | 15,1 |
| Імпарт натуральнага газу, млрд. м³ | 17,1 | 20,1 | 20,6 |
| Экспарт калійных угнаенняў (у пераводзе на дзейсн. рэчыва), тыс. т | 2 840 | 24 288 | 74 354 |
| Імпарт легкавых аўтамабіляў, тыс. шт. | 57,7 | 131,3 | 180,4 |
| Імпарт кампутараў, тыс. шт. | 1001,6 | 738,1 | 1747,4 |

Крыніца: Дзяржаўны статыстычны камітэт Рэспублікі Беларусь

**ТАБЛІЦА 3.** ВАЛАВАЯ ЗНЕШНЯЯ ЗАПАЗЫЧАНАСЦЬ РБ ЗА 2003–2007 ГАДЫ (МЛН. ДОЛ. ЗША)

| | 01.01.04 | 01.01.05 | 01.01.06 | 01.01.07 | 01.01.08 |
|---|---|---|---|---|---|
| Сукупная знешняя запазычанасць | 4 174,9 | 4 935,4 | 5 128,2 | 6 844,1 | 12 493,5 |
| Органы дзяржкіравання | 343,9 | 492,1 | 606,8 | 589,0 | 2 036,3 |
| Банкі | 400,7 | 625,8 | 948,3 | 1 486,7 | 2 570,8 |
| Іншыя сектары | 2 853,6 | 3 402,5 | 3 219,1 | 4 368,0 | 6 782,0 |
| Прамыя інвестыцыі:міжфірмовае крэдытаванне | 293,0 | 338,2 | 353,3 | 399,7 | 508,2 |

# БЕЛАРУСКІХ РЭФОРМАЎ?

стабілізавалі ажыятажны попыт на валюту. Хаця па некаторых сектарах эканомікі попыт перавышае прапанову ў 10 разоў. У гэтай сітуацыі банкі ствараюць «падушку бяспекі» і толькі за верасень скарацілі золатавалютныя рэзервы Нацыянальнага банку на 0,7 мільярда долараў — да 4,9 мільярд долараў.

### Што рабіць?

Вернемся, аднак, да палітычнай рыторыкі вакол крызісу. Яна выразна падзяляецца ўжо на ўнутраную — папулісцкую і знешнюю — прагматычную. З прагматычнай можна пагадзіцца. Міністр эканомікі сказаў: «Ці то да шчасця, ці то да жалю, але Беларусь — краіна, якая аказалася, з погляду міжнародных фінансавых інстытутаў, недаразвітай. Акцыі нашых прадпрыемстваў на транснацыянальных пляцоўках не каціраваліся, таму значных прамых страт у нас не будзе. Але, з іншага боку, безумоўна, фінансавы крызіс ускосна паўплывае і на нас: скарачаецца попыт і на расійскім рынку, і на іншых рынках. Таму можна прагназаваць аб'ектыўнае змяншэнне аб'ёмаў продажу нашай прадукцыі. Дадайце да гэтага цяжкасць доступу да крэдытных рэсурсаў або атрыманне крэдытаў па высокіх стаўках. Адсюль можа быць затрымка і ў працэсе мадэрнізацыі, і пры папаўненні абаротных сродкаў». Справядліва. Ёсць і першыя знешнія ацэнкі: агенцтва Standard & Poor's Ratings Services знізіла нам прагноз у рэйтынгу да «негатыўнага». Гэта значыць, што пры агульным скарачэнні наяўнасці крэдытных сродкаў іх даступнасць і цана для беларускага кіраўніцтва павышаюцца яшчэ больш.

**Сукупная знешняя запазычанасць складае пад 15 мільярдаў долараў і працягвае расці. Прадэклараваныя намеры пазычыць у Расіі і МВФ яшчэ 4 мільярда долараў**

У такіх умовах у кіраўніцтва краіны тым не менш застаюцца прыдатныя і адпаведныя сітуацыі інструменты для паслядоўнага выкарыстання. Напрыклад, дэвальвацыя рубля. Праўда, для нашага кіраўніцтва гэта тэрапія адчаю. Як было паказана ў шматлікіх папярэдніх аналізах BISS і яго партнёраў, стабільнасць абменнага курсу і давер насельніцтва да нацыянальнай валюты — адзін з падмуркаў «сацыяльнага кантракту» паміж уладай і грамадствам. Мікракрызіс у беларуска-расійскіх адносінах у 2006–2007 гадах справакаваў набег на банкі, наступствы якога былі зліквідаваныя толькі тэрміновым крэдытам, за якімі прыйшлося расплаціцца прыватызацыяй мабільнага аператара Velcom. Таму, нават нягледзячы на тое, што пры адмоўным сцэнары развіцця «вонкавых» чыннікаў (кошты на нафту, попыт на расійскім рынку і наяўнасць крэдытных рэсурсаў) дэвальвацыя, верагодна, стане непазбежнай, можна прагназаваць, што да яе беларускія ўлады звернуцца ў апошнюю чаргу.

Яшчэ адзін інструмент барацьбы з крызісам — лібералізацыя эканомікі. Яна ўжо абвешчаная, але яшчэ патрэбна грунтоўная яе легітымізацыя. Працэс дэ-факта пачаўся, маючы пад увагай заявы кіраўніка дзяржавы пра тое, што вольнага рынку «баяцца не варта». Парадаксальна, але такія заявы адбываюцца на тле абрання новага амерыканскага прэзідэнта, які выступае за пераразмеркаванне багацця. У той жа час тэрміновыя меры па скарачэнню імпарту, такія, як увядзенне максімальных надбавак у гандлі імпартаванай прадукцыі, паказваюць, што да паўнавартаснай лібералізацыі яшчэ далёка. Сігналам пра яе надыход зацікаўленыя асобы пры жаданні могуць лічыць стопрацэнтную гарантыю бяспекі ўсіх банкаўскіх дэпазітаў і выдзяленне Аграпрамбанку мільярда долараў падтрымкі.

Пры скарачэнні доступу да крэдытных рэсурсаў і палітычнай немэтазгоднасці дэвальвацыі прыватызацыя можа стаць галоўным інструментам забеспячэння бяспекі беларускай эканомікі. Аднак варта заўважыць, што прыватызацыя мусіць адбывацца на фоне скарачэння попыту на беларускія актывы і іх кошту. Варыянты развіцця падзеяў вакол сотні з палавінаю прадпрыемстваў, якія ўключаны ў прэзідэнцкі ўказ № 605, а значыць, падлягаюць асаблівай працэдуры акцыянавання і прыватызацыі, чым далей, тым болей цьмяныя, бо ў расіян імпэт знікае. Скандальная адмена беларуска-расійскай нарады на вышэйшым узроўні і рашэнне Пуціна будаваць нафтапровод з Унечы да Санкт-Пецярбургу паніжае імпэт і ў заходніх пакупнікоў.

Для манеўру застаецца ўсё менш пляцовак, напрыклад, аграрная рэформа (каналізацыя сацыяльнай і эканамічнай актыўнасці) або скарачэнне амбіцыйных інвестыцыйных праектаў, якія будзе вельмі цяжка фінансаваць за кошт крэдытаў. Усё паказвае на тое, што Беларусь трапляе ў сітуацыю, якая змушае да рэформаў. Але ўрад рэагуе на тое ростам кантролю і спробамі прапанаваць беспрафіцытны бюджэт. Як той казаў: «Хрэсьбін няма, але падрыхтоўка ідзе».

АКЦЫЯ

# ІП ВЕРАЦЬ ТОЛЬКІ АДНАМУ ЧАЛАВЕКУ Ў КРАІНЕ

Вольга ХВОІН

**Марш індывідуальных прадпрымальнікаў і мітынг у сталічным парку «Дружбы народаў», як і настойвалі на тым арганізатары з ГА «Песпектыва», адбыўся па-за палітыкай. Ці амаль па-за палітыкай.**

Каля дзвюх з паловай тысяч прадпрымальнікаў прайшліся па Мінску, размахвалі сцяжкамі з надпісам «прадпрымальнік Беларусі» і скандавалі лозунгі «Работу!», «Свабоду прадпрымальнікам!». Пасля невялікага шэсця па горадзе ў парку каля плошчы Бангалор адбыўся мітынг, на якім выступіў лідэр «Перспектывы» Анатоль Шумчанка. Ён зачытаў рэзалюцыю, паводле якой прадпрымальнікі патрабуюць захаваць цяперашнія ўмовы працы і дзеянне пункта 3 указа 285, у якім гаворыцца аб тым, што тавары, якія паходзяць з трэціх краінаў і выпушчаныя ў абарот у Расіі, не падлягаюць мытнаму афармленню і мытнай пошліне. Таксама ІП патрабуюць захаваць фіксаваны падатак на даданую вартасць (ПДВ) і адмяніць абмежаванні па найму працаўнікоў індывідуальнымі прадпрымальнікамі ці хаця б дазволіць наймаць на працу да пяці працаўнікоў без абмежаванняў па ступені роднасці.

Акрамя таго, прадпрымальнікі прапанавалі стварыць пры Адміністрацыі прэзідэнта камісію, якая б разглядала прапановы гандляроў і садзейнічала паляпшэнню ўмоў працы, з гэтай жа мэтай ІП хочуць, каб быў прызначаны ўпаўнаважаны па пытаннях малога і сярэдняга бізнесу пры кіраўніку Беларусі. «Мы рэкамендуем Лукашэнку разгледзець пытанні, звязаныя з кампетэнцыяй чыноўнікаў, што адказныя за працу з прадпрымальнікамі, якія дапусцілі пагаршэнне сітуацыі ў малым і сярэднім бізнесе ў святле апошніх пастаноў», — агучыў кіраўнік «Перспектывы» падрыхтаваную рэзалюцыю. Намесніка міністра эканомікі Андрэя Тура Анатоль Шумчанка назваў «непаслядоўным чыноўнікам»: «Не так даўно ён абяцаў, што льготныя ўмовы для працы прадпрымальнікаў не будуць адмененыя, аднак свайго слова не стрымаў».

Пасля крытыкі чыноўніцкага апарату Шумчанка заявіў, што ў Беларусі застаўся толькі адзін чалавек, якому ІП могуць верыць, — гэта Аляксандр Лукашэнка. «Мы будзем верыць толькі яму і падпісаным толькі ім дакументам», — падкрэсліў лідэр «Перспектывы». Рэзалюцыю, якую плануецца перадаць у кіраўнічыя органы дзяржавы, прадпрымальнікі прынялі хутка і фактычна аднагалосна. Пасля гэтага Анатоль Шумчанка аб'явіў, што мітынг завяршыўся.

Нікому іншаму Шумчанка выступіць перад прадпрымальнікамі не прапанаваў, і ўжо калі людзі пачалі разыходзіцца слова ўзялі старшыня Каардынацыйнай рады прадпрымальнікаў Аляксандр Макаеў і праваабаронца Ігар Леднік (ён жа быў адным са сведак на судовых працэсах над моладзевымі актывістамі, якія былі асуджаныя за ўдзел у студзеньскім мітынгу прадпрымальнікаў). Той-сёй у натоўпе абураўся падыходам спадара Шумчанкі да арганізацыі акцыі.

Старшыня незарэгістраванага прадпрымальніцкага саюза «Разам» Ірына Яскевіч з Віцебска ў размове з карэспандэнтам «НЧ» заўважыла, што для прадстаўнікоў іншых прадпрымальніцкіх рухаў падобныя паводзіны арганізатараў шэсця і мітынгу непрыемныя. «Анатоль Шумчанка гаворыць, што акцыю зладзіла толькі «Перспектыва», але гэта не так, — з абурэннем гаворыць спадарыня Яскевіч. — Тут вельмі многа людзей з рэгіёнаў, якія да гэтай арганізацыі дачынення не маюць. І яны хацелі б таксама выступіць, хацелі б, каб ім далі магчымасць звярнуцца да сваіх калег. Мы прыехалі ў Мінск самі, арганізавалі іншых прадпрымальнікаў, а нас проста не заўважаюць. Нам нельга цяпер дзяліцца, а атрымліваецца якраз наадварот, падобна на тое, што некаторыя проста імкнуцца перацягнуць на сябе ўвагу».



Photo.ByMedia.Net

Між іншым, праблема працаўладкавання індывідуальных прадпрымальнікаў для рэгіёнаў нават больш актуальная, чым для Мінска. Калі пытанні аб умовах працы ІП не будуць вырашаныя, з наступнага 2009 года гандляры абяцаюць распачаць новыя акцыі пратэсту. Першая верагодная акцыя прызначаная на 12 студзеня.

Сумесь першамайскай дэманстрацыі і пратэстнай акцыі, як ні глядзі, атрымалася неадназначная. Быццам і былі заяўленыя патрабаванні да ўраду, агучаныя словы пра неабходнасць кансалідацыі прадпрымальнікаў дзеля адстойвання сваіх інтарэсаў. Але адкрытае ігнараванне іншых лідэраў прадпрымальніцкага руху і звязванне апошніх надзей з чалавекам, які не так даўно публічна назваў ІПэшнікаў «вашывымі блохамі», правакуе на думкі, што нешта ў прадпрымальніцкім асяродку ўсё ж не так. Ці то ідзе змаганне за працу і хлеб для гандляроў, ці то за ўласную папулярнасць і магчымасці тыражаваць плакаты з цытатамі самога сябе.

ЮБІЛЕЙ

# Алег Волчак: ПРАВААБАРОНЦА — НЕ ПРАФЕСІЯ, А ПРЫЗВАННЕ

**Нядаўна споўнілася дзесяць гадоў з дня ўтварэння праваабарончай арганізацыі «Прававая дапамога насельніцтву». Пра акалічнасці яе стварэння, мэты і дзейнасць карэспандэнту «НЧ» Язэпу Палубятку распавядае яе заснавальнік, юрыст Алег Волчак.**



## Прававая дапамога

Праваабарончай дзейнасцю я займаюся даўно. Яшчэ ў тыя часы, калі я быў дэпутатам Мінгарсавета, імкнуўся ўсімі даступнымі мне сродкамі абараняць апазіцыю — тых, каго збівалі падчас акцый пратэсту. У выніку гэта прывяло да таго, што на сваёй сталай працы, у пракуратуры, я ўжо не мог зрабіць кар'еру. Калі мне давялося сысці з пасады старшага следчага, вырашыў стварыць арганізацыю, якая б аказвала прававую дапамогу.

Неўзабаве быў праведзены сход і пададзены дакументы на рэгістрацыю. Так напрыканцы 1998 года паўстала мінская гарадская арганізацыя «Прававая дапамога насельніцтву». Наша мэта — аказваць прававую дапамогу найперш сацыяльна неабароненым людзям. Аднак нашы сябры не толькі давалі бясплатныя юрыдычныя кансультацыі, але і актыўна ўдзельнічалі ў палітычным жыцці краіны. Натуральна, уладам не вельмі падабалася, калі добрыя юрысты прафесійна абараняюць простых грамадзян, бо праблемы, з якімі людзі сутыкаюцца часцей за ўсё, узнікаюць менавіта падчас стасункаў з прадстаўнікамі ўлады (чыноўнік пакрыўдзіў, дырэктар звольніў і г.д.).

Ведамасць нашай арганізацыі прынеслі такія справы, як адстойванне інтарэсаў грамадзян, дзеці якіх загінулі на Нямізе, а таксама дапамога сваякам зніклых палітыкаў, абарона людзей, што былі збітыя амапаўцамі падчас палітычных акцый, — напрыклад, справы Аляксандра Шчурко, Уладзіміра Чарнова, Вольгі Бар'ялай, якіх падчас першага «Маршу Свабоды» дзве гадзіны вазілі ў міліцэйскім аўтобусе і здзекаваліся. Што датычыць пацярпелых на Нямізе, то іх сваякам, акрамя абароны іх правоў, мы дапамаглі зарэгістраваць арганізацыю «Цэнтр сацыяльнай абароны «Няміга–99».

Дарэчы, за дзесяць гадоў існавання «Прававая дапамога насельніцтву» аказала дапамогу прыкладна 8000 чалавек. І ўсе гэтыя дзесяць гадоў чыноўнікі пастаянна чынілі нам усялякія перашкоды: арганізацыю пазбавілі ліцэнзіі на аказанне юрыдычных паслуг, нам давялося дзевяць разоў мяняць памяшканні, бо ўвесь час адмаўлялі ў арэндзе. А ў 2003 годзе па рашэнні Мінскага гарадскога суда наша арганізацыя была ліквідавана. Матывацыя для вынясення такога жорсткага прысуду папросту смешная — нельга бясплатна аказваць прававую дапамогу насельніцтву. Адстойваючы правы на існаванне арганізацыі, мы дайшлі да Вярхоўнага суда, дзе нам таксама адмовілі, і зараз наша справа будзе разглядацца ў Камітэце па правах чалавека ААН. Аднак нягледзячы на тое, што «Прававую дапамогу насельніцтву» зачынілі, мы працягваем працаваць і аказваць юрыдычную дапамогу як прыватныя юрысты. Сябры нашай арганізацыі маюць юрыдычныя дыпломы. Мы адкрыта даем аб'явы, што юрысты Алег Волчак, Аляксандр Мікулін, Анатоль Папоў, Яна Палякова, Юры Белякоў, Сяргей Фамін, Алеся Мураўёва і іншыя аказваюць юрыдычную дапамогу. Дзеля гэтага нам не трэба ніякіх ліцэнзій і дазволаў, таму што кожны грамадзянін можа бясплатна дапамагаць любому чалавеку, які патрапіў у бяду. Нашы юрысты і зараз дапамагаюць людзям адстойваць іх канстытуцыйныя і грамадзянскія правы. За пяць гадоў да нас не было ніякіх прэтэнзій, дый не магло быць, бо мы даем кваліфікаваныя і бясплатныя кансультацыі.

У апошнія гады мы ўсёй камандай працавалі на вызваленне Аляксандра Казуліна. Мы і зараз працягваем падтрымліваць яго, але кожны наш юрыст таксама займаецца і шматлікімі справамі іншых грамадзян, якім патрэбна прававая дапамога.

На сённяшні дзень асноўныя нашы кліенты — моладзь, што навучаецца за мяжой па праграме Каліноўскага, у ЕГУ у Вільні. Па вяртанні на радзіму студэнтаў пераследуюць, ёсць факты спробаў іх вярбоўкі супрацоўнікамі КДБ.

Акрамя таго, зараз людзей, асабліва маладых, масава выклікаюць у ваенкаматы, РАУСы, каб нібыта праверыць іх дачыненне да выбухаў, а там у кожнага бяруць адбіткі пальцаў, сліну. Дадзіцца кожнаму чалавеку тлумачыць, што гэта добраахвотная справа, усім раім не згаджацца на гэтыя працэдуры. Мы нават выпусцілі на гэты конт спецыяльныя карткі і раздаём іх людзям — многім гэта дапамагло.

Апошнім часам стаў надзвычай актуальным яшчэ адзін накірунак дзейнасці. У сувязі з эканамічным крызісам людзей пачынаюць звальняць з працы па розных надуманых падставах. Нашы юрысты расказваюць людзям пра іх правы, пра асаблівасці кантрактнай сістэмы, даюць парады, як абараняць свае інтарэсы. Нашы юрысты працуюць супольна з прафсаюзамі.

Мы таксама выдаем бюлетэні, кнігі на юрыдычную тэматыку, якія раздаюцца бясплатна ва ўсіх рэгіёнах РБ. Апошняя кніга — «Хатні адвакат» — выйшла накладам 1000 асобнікаў. У яе ўвайшлі артыкулы па найбольш важных пытаннях юрыдычнай практыкі, якія друкаваліся ў газетах «Згода», «Новы час», «Народная воля». Увесь наклад быў разасланы па арганізацыях, установах, прадпрыемствах, палітычных партыях, прафсаюзах — паўсюдна, дзе ёсць магчымасць навучаць людзей, як правільна адстойваць свае законныя інтарэсы. З выдадзенага раней можна адзначыць кнігу пра Юрыя Захаранку «Хроніка дзяржаўнай подласці».

Нашы юрысты надаюць шмат увагі праблемам афганцаў. І не толькі таму, што я сам прайшоў Афганістан, але яшчэ і таму, што сярод былых афганцаў шмат тых, хто працуе на дэмакратыю. Напрыклад, прадпрымальнік Віктар Гарбачоў, кіраўнік таварыства інвалідаў Аляксандр Камароўскі, былы палітвязень Мікалай Аўтуховіч, журналіст Сяргей Аніська і іншыя.

## Пераслед

Пасля закрыцця судом у 2003 годзе «Прававой дапамогі насельніцтву» ўлада ўзялася непасрэдна за нашых юрыстаў. Так, напрыклад, падчас парламенцкіх выбараў юрыста Яну Палякову з Салігорска выклікалі ў кампетэнтныя органы і патрабавалі падпісаць заяву, што яна не збірала подпісы за Вольгу Казуліну. Калі яна папрасіла паказаць тую заяву, атрымала дубінкай па пальцах. Да цяперашняга часу лечыць руку. Палякова падала скаргу, пасля чаго невядомыя напалі на яе ў пад'ездзе. Дарэчы, у падтрымку Яны Паляковай міжнародная праваабарончая арганізацыя «На перадавой» накіравала лісты Лукашэнку і Генеральнаму пракурору, у якіх патрабуе правесці спецыяльнае расследаванне і пакараць вінаватых. Але, па меркаванню пракуратуры, ва ўсім, што здарылася з Янай, няма складу злачынства.

Мяне самога тройчы збівалі. Першы раз — 21 чэрвеня 1999 года, калі праводзілася акцыя «Апошні дзень прэзідэнта», падрыхтаваная Віктарам Ганчаром на Кастрычніцкай плошчы. Пасля акцыі мяне затрымалі і збілі так, што страціў прытомнасць. Мяне адвезлі ў лякарню, але міліцыянты запэўнілі медыкаў, што я асабліва небяспечны злачынца, і праз пару гадзін мяне адправілі ў пастарунак. У маю абарону выступілі Шарэцкі, Ганчар, шматлікія СМІ, і наступнай раніцай мяне выпусцілі і нават праз тры месяцы спынілі надуманую справу пра збіццё мною міліцыянера. Пасля гэтага Міжнародная ліга правоў чалавека ўзнагародзіла мяне прэміяй «Дзень абаронцы», якая штогод уручаецца 10 снежня праваабаронцам, што пацярпелі ад уладаў. Другім разам невядомай асобай мне была нанесена рана пад вокам. Міліцыя адмовілася заводзіць крымінальную справу, і хоць гэта пытанне перад Генеральным пракурорам Шэйманам падняў дэпутат Еўрапарламента Пургурыдзіс, але справе ўсё роўна не былі дадзены ход.

Апошні раз я пацярпеў у 2006-м, калі супрацоўнік спецназу пырснуў у вочы газам. Гэта справа таксама будзе разглядацца ў Камітэце па правах чалавека ААН.

## Каманда

Галоўнае ў кожнай справе — імідж, але яго робіць каманда, а не адзін чалавек. Я ганаруся сваёй камандай і ўдзячны кожнаму за добрасумленную працу. Прафесія праваабаронца — гэта прызванне, нават пакліканне, бо не кожны можа вытрымаць такі ўціск. Калі я быў на канферэнцыі па праваабарончых пытаннях у Вене, адзін італьянскі парламентар сказаў, што праваабаронцы — люстэрка грамадства, і іх варта берагчы. Яны даюць сапраўдную карціну таго, што адбываецца ў грамадстве, а калі на іх пачынаецца ўціск, то гэта значыць, што з дэмакратыяй у краіне не ўсё добра. Няма праваабаронцаў — няма дэмакратыі.

Галоўная наша перамога апошніх дзён тычыцца ўзяцця адбіткаў пальцаў у ваенкаматах. Толькі па адным Цэнтральным раёне Мінска за тры месяцы ўзялі адбіткі ў 15 тысяч чалавек. Мы напісалі на імя Генеральнага пракурора Васілевіча ліст з патрабаваннем разабрацца, на якой падставе ваенкаматы праводзяць гэтую працэдуру, і спыніць незаконныя дзеянні. Адказ быў такім: Мінская ваенная пракуратура пакарала намесніка Цэнтральнага мінскага РВК за тое, што ён адмовіў мне ў тлумачэнні, на якой падставе праводзіцца гэта працэдура. За свае незаконныя дзеянні з яго спагналі 140000 рублёў штрафу. Але яшчэ мы чакаем адказу ад Беларускай ваеннай пракуратуры наконт законнасці зняцця адбіткаў пальцаў грамадзян ваенкаматамі.

## Будучыня

У бліжэйшы час мы зарэгіструем нашу арганізацыю на Украіне, тады атрымаем афіцыйны міжнародны статус. Адразу ж, як толькі з'явіцца магчымасць, мы абавязкова паўстанем як беларуская рэспубліканская арганізацыя. А пакуль «Прававая дапамога насельніцтву» будзе працягваць сумленна працаваць на карысць людзей.

Нам давяраюць не толькі простыя грамадзяне, але і супрацоўнікі сілавых структураў, прадстаўнікі органаў пракуратуры, яны прадстаўляюць у нашу арганізацыю многа матэрыялаў аб карупцыі. Многае з гэтага мы пасля накіроўваем у сродкі масавай інфармацыі. На ніве абароны правоў чалавека актыўна працуюць былыя прадстаўнікі сілавых структур, людзі, у якіх ёсць пачуццё грамадзянскай адказнасці і жаданне справядлівасці. Такія як Іван Крук з Астраўца, Анатоль Папоў са Жлобіна, Аляксандр Мікулін з Віцебшчыны, Іван Лабачоў з Мінска і іншыя. Шмат хто не «свецяцца», але дапамагае складаць скаргі, кансультуе і выконвае іншую працу.

Я вельмі ўдзячны маёй жонцы Людміле, якая з цярплівасцю і разуменнем ставіцца да маёй дзейнасці, хоць яна, напэўна, хацела б, каб у мяне была больш спакойная праца, адпаведны заробак. У мяне шасцігадовая дачка, з якой мы ў вольны час здымаемся ў кіно як акцёры масавых сцэнаў. Гэта мне падабаецца, бо яшчэ студэнтам я іграў у тэатры юрфака. Апошні фільм, дзе мы здымаліся, мае напраўдзівую назву «Пскоўская місія».

Але нягледзячы на сваю прыхільнасць да акцёрства, я праваабаронца не толькі па прафесіі, але і па прызванню.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

TV

## 22 СНЕЖНЯ, ПАНЯДЗЕЛАК

---

**05.30** Дакументальна-пазнавальны серыял «Таямнічы свет жывёл» (Францыя).
**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.05, 07.05, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 08.25, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.20** Гатуем разам.
**08.30** У свет матораў.
**09.05, 15.25** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.10** Nota Bene.
**09.35** Здароўе.
**10.05** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё». «Я стала ахвярай бабніка».
**11.00** Серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**12.10** Крымінальная камедыя «Забіць Бэлу» (Расія).
**14.02** «Белавежская пушча». Хранікальна-дакументальны фільм.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.30** Культурныя людзі.
**16.00** Гульнявое шоў «Інтуіцыя».
**16.50** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**17.50** Серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**18.50, 01.35** Зона Х. Крымінальная хроніка.
**19.35** Арэна. Праграма аб спорце.
**19.55** Ток-шоў «Ход у адказ».
**21.00** Панарама.
**21.50** Ваенны дэтэктыў «Апостал» (Расія).
**00.00** Прыгодніцкая камедыя «Паветраныя замкі» (ЗША).
**01.45** Дзень спорту.
**01.55** Усе стыхіі.

---

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Контуры.
**10.10** АНТ прадстаўляе: «Дыханне планеты».
**10.45** Ералаш.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Кантрольны закуп».
**11.50** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.50** «Модны прысуд».
**15.00** Шматсерыйны фільм «Ключы ад смерці». 8-я серыя. Заключная.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** Рэаліці-шоў «Пасаг для нявесты».
**17.15** «Жарт за жартам».
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?» (Расія), 2005 год.
**19.00** Чакай мяне.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Ток-шоў «Выбар».
**22.00** «След». Шматсерыйны фільм.
**22.55** Нашы навіны.
**23.10** Навіны спорту.
**23.15** «Каханне скрозь гады».
**00.15** «Прафесійны бокс. Лепшыя баі».
**01.15** Нашы навіны.
**01.30** Навіны спорту.

---

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Тыдзень».
**09.30** «Вялікі сняданак».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Наша справа».
**10.50** «Жыццё працягваецца». Тэленавэла.
**11.45** «Багатая і каханая». Серыял.
**12.35** «Ваенная таямніца».
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** «Мая хата».
**14.20** «Здаровае дзяцінства».
**14.35** «Крутыя рабяты». Народнае шоў. Паўфінал.
**15.35** «Я - вандроўца».
**16.00** «Культурнае жыццё».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Спартовы тыдзень».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.25** «Багатая і каханая». Серыял.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.35** Фільм «Трое і сняжынка». Расія.
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
**00.05** «Закон і крымінал».
**00.10** «Крутыя рабяты». Дзённік.
**00.20** «Сталічны футбол».
**00.50** «Гучная справа».

---

**06.55** Ранішняя падзарадка.
**07.55** Усё аб бяспецы.
**08.25** Тэлебарометр.
**08.45** У гэты дзень.
**08.50** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**09.40** «Што такое воблака». Дак. фільм.
**10.30** Гаспадар.
**11.05** Прэмія «Оскар». Мастацкі фільм «Колер грошай» (ЗША).
**13.05** Серыял «Адплата за грахі» (Расія).
**13.55** Бухта капітанаў.
**14.35** Кіначасопіс «Жадаю ўсё ведаць».
**15.05** Пазакласная гадзіна.
**15.20** Гіпноз.
**16.10** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**17.05** Смачна з Барысам Бурдой.
**17.30** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**18.35** Навіны культуры.
**18.50** Дэтэктыўны серыял «Забойная сіла-1» (Расія).
**20.05** Беларуская часіна.
**21.05** Калыханка.
**21.25** Хакей. КХЛ. «Дынама» (Мінск) - «Барыс» (Астана).
**23.25** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**00.20** Хакей. Формула гульні.

---

РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.20** Фільм «Чарговы рэйс». 1958 г.
**11.00** Весткі.
**11.25** Пакой смеху.
**12.15** Прыгодніцкі фільм «Кошт скарбаў».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** «Я шчаслівы чалавек...». Дакументальны фільм.
**15.15** «Кулагін і партнёры».
**15.50** Суд ідзе.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** «Сумленны дэтэктыў».
**17.55** «Жанчына без мінулага». Тэлесерыял.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.35** Серыял «Вядзьмарскае каханне».
**20.40** Тэлесерыял «Райскія яблычкі».
**21.40** Серыял «Расійская імперыя. Пачатак». Фільм 2. «Царскае паляванне». 2 серыя.
**22.50** Навіны - Беларусь.
**23.00** «Весткі+».
**23.20** «Кулагін і партнёры».
**23.55** «Юнкеры. Апошнія рыцары імперыі».
**00.50** Заканчэнне эфіру.

---

НТВ

**06.00** Сёння.
**06.05** Канал «Сёння раніцай».
**08.45** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**09.05** «Сёння. Выніковая праграма».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Кулінарны паядынак».
**11.15** «Кватэрнае пытанне».
**12.10** «Следства вялі...».
**13.00** Сёння.
**13.30** Фільм «Шпіёнскія гульні».
**15.00** «Рускія не здаюцца!».
**15.30** «Агляд.Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**18.25** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.45** Дэтэктыўны серыял «Глушэц».
**21.55** «І зноў добры дзень!».
**23.00** Сёння.
**23.35** «Ты смешны!». Усерасійскі конкурс народных гумарыстаў.
**00.25** Містычны серыял «Медыум».
**01.10** «Школа зласлоўя».

---

EUROSPORT

**09.30** Зімовыя віды спорту. Агляд.
**10.00** Горныя лыжы. Кубак свету ў Італіі (Альта Бадзія). Мужчыны. Слалам-гігант. 2-я спроба.
**11.00** «Формула-1». Часопіс.
**11.30** «Формула-1». Часопіс.
**12.00** «Формула-1». Часопіс.
**12.30** Біятлон. Кубак свету ў Аўстрыі (Хахфільцэн). Жанчыны. Эстафета.
**13.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Швейцарыі (Энгельберг). HS 137.
**14.30** Біятлон. Кубак свету ў Аўстрыі (Хахфільцэн). Мужчыны. Эстафета.
**15.30** Біятлон. Кубак свету ў Аўстрыі (Хахфільцэн). Жанчыны. Эстафета.
**16.00** Снукер. Чэмпіянат Вялікабрытаніі (Тэлфард). Фінал.
**18.00** Футбол. Класіка Лігі чэмпіёнаў УЕФА. «Чэлсі».
**19.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**19.30** Футбол. Еўрагалы. Часопіс. Лепшыя эпізоды.
**20.00** Футбол. Кваліфікацыя да Кубка свету-2010. ПАР. Агляд-2008.
**21.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. «Шлях у Японію».
**23.00** Конны спорт. Міжнародныя спаборніцтвы па канкуры ў Вялікабрытаніі (Лондан). Прамая трансляцыя.
**00.00** Вось дык так!!!
**01.00** «Рэмі Гэйар». Часопіс.
**01.30** «Формула-1». Часопіс.
**02.00** «Формула-1». Часопіс.

## 23 СНЕЖНЯ, АЎТОРАК

---

**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00, 23.55** Навіны.
**06.02, 07.05** Прэс-агляд.
**06.05** Дзень спорту.
**06.15, 07.10, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 08.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.20** Гатуем разам.
**08.35** Арэна. Праграма аб спорце.
**09.05, 13.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.15** Дэтэктыўная меладрама «Монтэкрыста» (Расія).
**10.10** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**11.00** Серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**12.10** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**13.05** Тэлесерыял «Адчайныя хатнія гаспадыні-2» (ЗША).
**14.05** Ток-шоў «Ход у адказ».
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.25** Відэафільм АТН «Браслаўскія азёры» цыклу «Зямля беларуская».
**15.40** Дэтэктыўны серыял «Таямніцы следства-3» (Расія).
**16.45** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**17.45** Серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**18.50, 00.00** Зона Х. Крымінальная хроніка.
**19.30** Сфера інтэрасаў.
**19.55** Дэтэктыўная меладрама «Монтэкрыста» (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.50** Ваенны дэтэктыў «Апостал» (Расія). Заключныя серыі.
**00.05** Дзень спорту.
**00.20** «Осцін Пауэрс - міжнародны чалавек-загадка». Эксцэнтрычная камедыя (ЗША-Германія).

---

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** Чакай мяне.
**10.00** «Каханне скрозь гады».
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Адзін супраць усіх».
**12.00** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.50** Камедыя «Трое ў лодцы, не лічачы сабакі». 1-я серыя.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Агонь кахання». Шматсер. фільм.
**17.10** «Хай кажуць» з Андрэем Малахавым.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?» (Расія), 2005 год.
**18.55** Прэм'ера. «Рудая». Шматсерыйны фільм. 13-я серыя.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Шматсерыйны фільм «Спадчына». 5-я серыя.
**22.15** «След». Шматсерыйны фільм.
**23.10** Нашы навіны.
**23.25** Навіны спорту.
**23.30** «Застацца ў жывых». Шматсер. фільм.
**00.25** «Акцёры адной ролі».
**01.25** Нашы навіны.
**01.40** Навіны спорту.

---

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Міншчына».
**06.20** «Закон і крымінал».
**06.25** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** Фільм «Трое і сняжынка». Расія.
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Крутыя рабяты». Дзённік.
**10.50** «Жыццё працягваецца». Тэленавэла.
**11.45** «Багатая і каханая». Серыял.
**12.35** «Гучная справа».
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** «Новыя падарожжы дылетанта».
**14.20** «Крутыя рабяты». Дзённік.
**14.30** «Элен і рабяты - 2». Моладзевы серыял.
**15.30** «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Сталічны футбол».
**17.20** «Міншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.25** «Багатая і каханая». Серыял.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.30** «Аўтапанарама».
**20.50** «Шырокая рака». Серыял.
**22.00** «Рэпарцёр СТБ».
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** «StartUp!» Тэлегульня.
**23.20** «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
**00.25** «Закон і крымінал».
**00.30** «Крутыя рабяты». Дзённік.
**00.40** «Рэактыўны бокс».
**01.10** «Надзвычайныя гісторыі».

---

**06.55** Ранішняя падзарадка.
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.20** Дэтэктыўны серыял «Забойная сіла-1» (Расія).
**09.15** У гэты дзень.
**09.20** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**10.10** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**11.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**12.00** Хакей. Формула гульні.
**12.25** Прыгодніцкая камедыя «Пан» (Расія). 1-я серыя.
**13.25** Серыял «Адплата за грахі» (Расія).
**14.15** Кінаграфія «Жадаю ўсё ведаць».
**15.00** Пазакласная гадзіна.
**15.10** Бітва экстрасэнсаў.
**16.00** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**16.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**17.30** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**18.35** Навіны культуры.
**18.50** Дэтэктыўны серыял «Забойная сіла-1» (Расія).
**20.05** Беларуская часіна.
**21.05** Калыханка.
**21.30** Камедыйны дэтэктыў «Шукайце жанчыну» (СССР). 1-я серыя.
**23.05** Спорт-кадр.
**23.40** Хакей. НХЛ. Атланта - Таронта.

---

РОССИЯ ТЕЛЕКАНАЛ

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.10** Серыял «Вядзьмарскае каханне».
**10.05** Тэлесерыял «Райскія яблычкі».
**11.00** Весткі.
**11.25** Серыял «Расійская імперыя. Пачатак». Фільм 2. «Царскае паляванне». 2 серыя.
**12.25** Гістарычны фільм «Казачая быль».
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** «Хай заўсёды буду я. Леў Ашанін».
**15.15** «Кулагін і партнёры».
**15.50** Суд ідзе.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** «Вандраванні натураліста».
**17.55** «Жанчына без мінулага». Тэлесерыял.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.35** Серыял «Вядзьмарскае каханне».
**20.40** Тэлесерыял «Райскія яблычкі».
**21.40** Серыял «Расійская імперыя. Пачатак». Фільм 3. «Павел».1 серыя.
**22.50** Навіны - Беларусь.
**23.00** «Весткі+».
**23.20** «Кулагін і партнёры».
**23.55** Прэм'ера. «Мой ласкавы і далікатны звер. Эміль Лоцяну». Дак. фільм.
**00.45** Заканчэнне эфіру.

---

НТВ

**06.00** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**09.00** «І зноў добры дзень!».
**10.00** Сёння.
**10.25** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**10.50** «Quattroruote». Праграма пра аўтамабілі.
**11.20** Вострасюжэтны серыял «Добрыя хлопцы».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.30** Дэтэктыўны серыял «МУР ёсць МУР-2».
**15.10** «Вар'яцкі дзень. Агляд».
**15.35** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**18.25** «Агляд.Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.40** Дэтэктыўны серыял «Глушэц».
**21.55** «Следства вялі...».
**23.00** Сёння.
**23.35** «Ты смешны!». Усерасійскі конкурс народных гумарыстаў.
**00.25** Містычны дэтэктыўны серыял «Медыум».

---

EUROSPORT

**09.30** Экстрэмальны спорт. Моладзевая зона.
**10.00** Біятлон. Кубак свету ў Аўстрыі (Хахфільцэн). Жанчыны. Эстафета.
**10.30** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**11.00** «Формула-1». Часопіс.
**11.30** «Формула-1». Часопіс.
**12.00** Цырымонія адкрыцця. Летнія Алімпійскія Гульні ў Пекіне (Кітай).
**13.00** «Пекінскі экспрэс». Летнія Алімпійскія Гульні ў Пекіне (Кітай). Лепшыя моманты.
**15.00** Вось дык так!!! Летнія Алімпійскі гульні.
**15.30** Цырымонія закрыцця. Летнія Алімпійскія Гульні ў Пекіне (Кітай).
**16.15** Спартовая гімнастыка. Летнія Алімпійскія Гульні ў Пекіне (Кітай). Паказальныя выступы.
**17.00** Спартовая гімнастыка. Кубак свету ў Іспаніі (Мадрыд). Фінал.
**18.00** Футбол. Класіка Лігі чэмпіёнаў УЕФА. Рауль.
**19.00** «Формула-1». Часопіс.
**20.00** Вось дык так!!!
**22.00** Бокс.
**00.00** Покер. Турнір Race Trophy (Вена, Аўстрыя).
**01.00** Ралійная серыя IRC. Агляд сезону.
**01.30** «Формула-1». Часопіс.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ



## 24 СНЕЖНЯ, СЕРАДА

**05.10** Дэтэктыўны серыял «Таямніцы следства-3» (Расія).
**06.00, 07.00, 08.00, 09.00, 12.00, 13.00, 14.00, 15.00, 16.00, 17.00, 18.00, 19.00** Навіны.
**06.02, 07.05** Прэс-агляд.
**06.05** Дзень спорту.
**06.15, 07.10, 08.10** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**06.45, 07.45** Зона Х.
**07.30, 11.50** Дзелавое жыццё.
**08.20** Гатуем разам.
**08.35** Сфера інтэрасаў.
**09.05, 14.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.15** Дэтэктыўная меладрама «Монтэкрыста» (Расія).
**10.10** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**11.00** Меладраматычны серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**12.10** Гадзіна суду. Справы сямейныя.
**13.05** Тэлесерыял «Адчайныя хатнія гаспадыні-2» (ЗША).
**13.50** «Эпоха». Ігнат Дамейка. Часткі 1-я і 2-я.
**15.15, 19.20** Навіны рэгіёна.
**15.30** Хранікальна-дакументальны цыкл «Нябачны фронт» (Беларусь).
**15.45** Дэтэктыўны серыял «Таямніцы следства-3» (Расія).
**16.40** Меладрама «Гарачы лёд» (Расія).
**17.45** Меладраматычны серыял «Родныя людзі» (Украіна).
**18.50** Зона Х. Крымінальная хроніка.
**19.30** Зямельнае пытанне.
**19.55** Дэтэктыўная меладрама «Монтэкрыста» (Расія).
**20.50** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**21.00** Панарама.
**21.45** Святочнае багаслужэнне на Раство Хрыстова з Магілёўскага касцёла Унебаўзяцця Найсвяцейшай Панны Марыі. Прамая трансляцыя.
**23.45** «Шчаслівых Каляд». Меладрама (Францыя).

**06.00, 06.30, 07.00, 07.30, 08.00, 08.30, 09.00** Нашы навіны.
**06.05** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**09.05** «Рудая». Шматсерыйны фільм.13-я серыя.
**10.00** Шматсерыйны фільм «Спадчына». 5-я серыя.
**11.00** Нашы навіны.
**11.05** Навіны спорту.
**11.10** «Кантрольны закуп».
**11.50** «Малахаў+».
**13.00** Нашы навіны.
**13.05** Навіны спорту.
**13.10** «Зразумець. Прабачыць».
**13.40** «Модны прысуд».
**14.50** Камедыя «Трое ў лодцы, не лічачы сабакі». 2-я серыя. Заключная.
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Агонь кахання». Шматсерыйны фільм.
**17.10** «Хай кажуць» з Андрэем Малахавым.
**18.00** Нашы навіны.
**18.15** Навіны спорту.
**18.20** Камедыйны серыял «Хто ў хаце гаспадар?» (Расія), 2005 год.
**18.55** Прэм'ера. «Рудая». Шматсерыйны фільм. 14-я серыя.
**20.00** Час.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Шматсерыйны фільм «Спадчына».6-я серыя.
**22.15** Камедыя «Брус Усемагутны».
**00.10** Нашы навіны.
**00.25** Навіны спорту.
**00.30** АНТ прадстаўляе: «Любімыя песні для добрага свята».
**02.00** Нашы навіны.
**02.15** Навіны спорту.

**06.00** «24 гадзіны».
**06.10** «Меншчына».
**06.20** «Закон і крымінал».
**06.25** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**07.30** «24 гадзіны».
**07.40** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**08.30** «Аўтапанарама».
**08.50** «Шырокая рака». Серыял.
**09.50** «Відавочнік» прадстаўляе: самае смешнае».
**10.00** «Пяць гісторый».
**10.30** «24 гадзіны».
**10.40** «Крутыя рабяты». Дзённік.
**10.50** «Жыццё працягваецца». Тэленавэла.
**11.45** «Багатая і каханая». Серыял.
**12.35** «Надзвычайныя гісторыі».
**13.30** «24 гадзіны».
**13.50** «Рэпарцёр СТБ».
**14.20** «Крутыя рабяты». Дзённік.
**14.30** «Элен і рабяты - 2». Моладзевы серыял.
**15.30** «Салдаты. Новы прызыў». Серыял.
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Рэактыўны бокс».
**17.20** «Меншчына».
**17.30** «Званая вячэра».
**18.25** «Багатая і каханая». Серыял.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.10** «СТБ-спорт».
**20.15** «Добры вечар, маляня».
**20.30** «Дабро пажаліцца».
**20.50** «Шырокая рака». Серыял. Заключная серыя.
**22.00** «Мінск і мінчане».
**22.30** «24 гадзіны».
**22.55** «СТБ-спорт».
**23.00** Фільм «Год залатой рыбкі». Расія, 2007 г.
**01.00** «Крутыя рабяты». Дзённік.

**06.55** Ранішняя падзарадка.
**07.55** Смачна з Барысам Бурдой.
**08.25** Дэтэктыўны серыял «Забойная сіла-1» (Расія).
**09.25** У гэты дзень.
**09.30** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**10.15** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**11.10** Свая музыка.
**11.40** Пасоўванне +.
**12.05** Спорт-кадр.
**12.35** Прыгодніцкая камедыя «Пан» (Расія). 2-я серыя.
**13.30** Серыял «Адплата за грахі» (Расія).
**14.20** Кіначасопіс для дзяцей «Жадаю ўсё ведаць» (Расія).
**15.00** Пазакласная гадзіна.
**15.15** «Касмаполітэн». Відэаверсія.
**16.10** Гадзіна суду з Паўлам Астахавым.
**17.00** Смачна з Барысам Бурдой.
**17.30** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**18.35** Навіны культуры.
**18.50** Дэтэктыўны серыял «Забойная сіла-1» (Расія).
**20.00** Беларуская часіна.
**21.05** Калыханка.
**21.25** Камедыйны дэтэктыў «Шукайце жанчыну» (СССР). 2-я серыя.
**23.00** «Іншыя». «Тры скарыначкі хлеба».
**23.30** Хакей. НХЛ. Агляд тыдня.

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.10** Серыял «Вядзьмарскае каханне».
**10.05** Тэлесерыял «Райскія яблычкі».
**11.00** Весткі.
**11.25** Серыял «Расійская імперыя. Пачатак». Фільм 3. «Павел».1 серыя.
**12.25** Фільм «На цябе спадзяюся». 1992 г.
**13.50** Навіны - Беларусь.
**14.00** Весткі.
**14.20** «Сведка часу. Уладзімір Навумаў». Дакументальны фільм.
**15.15** «Кулагін і партнёры».
**15.50** Суд ідзе.
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.25** «Тэатральны летапіс». Аляксандр Збруеў. Частка 2-я.
**17.40** «Жанчына без мінулага». Тэлесерыял.
**18.35** Навіны - Беларусь.
**18.45** Весткі.
**19.00** Вынікі года з Прэзідэнтам Расіі.
**20.00** Серыял «Вядзьмарскае каханне», 2008 г.
**21.00** Тэлесерыял «Райскія яблычкі».
**22.00** Серыял «Расійская імперыя. Пачатак». Фільм 3. «Павел».2 серыя.
**23.00** Навіны - Беларусь.
**23.10** «Весткі+».
**23.30** «Кулагін і партнёры».
**00.05** «Не нарадзіся прыгожай. Майя Булгакава».
**00.55** Заканчэнне эфіру.

**06.00** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**09.00** «І зноў добры дзень!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**10.50** «Quattroruote». Праграма пра аўтамабілі.
**11.20** Вострасюжэтны серыял «Добрыя хлопцы».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.30** Дэтэктыўны серыял «МУР ёсць МУР-3».
**15.10** «Вар'яцкі дзень. Агляд».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**18.25** «Агляд.Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.45** Дэтэктыўны серыял «Глушэц».
**21.55** «Следства вялі...».
**23.00** Сёння.
**23.35** «Ты смешны!». Усерасійскі конкурс народных гумарыстаў.
**00.25** Містычны дэтэктыўны серыял «Медыум».

**09.30** Вось дык так!!!
**11.00** «Формула-1». Часопіс.
**11.30** «Формула-1». Часопіс.
**12.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Фінляндыі (Куусама). Камандныя спаборніцтвы. HS 142.
**13.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Фінляндыі (Куусама). HS 142.
**14.00** Біятлон. Кубак свету ў Аўстрыі (Хахфільцэн). Мужчыны. Эстафета.
**15.00** Вось дык так!!!
**16.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Фінляндыі (Куусама). Камандныя спаборніцтвы. HS 142.
**17.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Фінляндыі (Куусама). HS 142.
**18.00** Футбол. Класіка Лігі чэмпіёнаў УЕФА. Олівер Кан.
**19.00** Футбол. Класіка Лігі чэмпіёнаў УЕФА. «Манчэстэр Юнайтэд» 1998 - 1999 гг.
**20.00** Цырымонія адкрыцця. Летнія Алімпійскія Гульні ў Пекіне (Кітай).
**21.00** «Пекінскі экспрэс». Летнія Алімпійскія Гульні ў Пекіне (Кітай). Лепшыя моманты.
**23.00** Вось дык так!!!
**23.30** Цырымонія закрыцця. Летнія Алімпійскія Гульні ў Пекіне (Кітай).
**00.15** Спартовая гімнастыка. Летнія Алімпійскія Гульні ў Пекіне (Кітай). Паказальныя выступы.
**01.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**01.30** «Рэмі Гэйар». Часопіс.
**02.00** Вось дык так!!!

## 25 СНЕЖНЯ, ЧАЦВЕР

**06.10** «Чарадзейныя Каляды». Камедыя-казка (Канада-ЗША).
**07.35** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**08.35** Гатуем разам.
**08.45, 14.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**08.50** Пастырскае слова Мітрапаліта Тадэвуша Кандрусевіча на Раство Хрыстова.
**09.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**09.10** Прэм'ера. «Суперсямейка». Прыгодніцкі анімацыйны фільм (ЗША).
**10.55** Мастацкая гімнастыка. Міжнародныя дзіцячыя спаборніцтвы «Baby Cup».
**12.15** «Пакроўскія вароты». Лірычная камедыя (СССР). 1-я і 2-я серыі.



**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Існасць. Святочная праграма.
**15.55** «Эпоха». Ігнат Дамейка. Частка 3-я.
**16.20** «Бацька нявесты». Сямейная камедыя (ЗША).



**18.15** Відэафільм АТН «Сіла прыцягнення» цыклу «Родныя людзі».
**18.40** «Музыка сэрца». Меладрама (ЗША).
**21.00** Панарама.
**21.40** Прэм'ера. «Дзённікі няні». Рамантычная камедыя (ЗША).
**23.45** Чэмпіянат свету па спартыўных танцах. Частка 1-я.

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Фільм «Безназоўная зорка».
**11.40** АНТ прадстаўляе: «Паўлінка NEW». Музычны фільм.
**13.40** АНТ прадстаўляе: «КВЗ у Мінску».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** «Хітры Джэк».
**17.30** Фільм «Карнавальная ноч-2. Пяцьдзесят гадоў пасля».
**20.30** Нашы навіны.
**20.50** АНТ прадстаўляе: «З каханнем з Беларусі». Канцэрт у Варшаве.
**23.20** Фільм «Кліч мяне Санта Клаўс».
**01.00** Нашы навіны.

**07.00** Фільм-казка «Спадарыня завіруха». ГДР, 1963 г.
**08.00** Меладрама «Зімовая вішня». СССР, 1985 г.



**15.35** «Званая вячэра».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.45** «Трэцяе вуха». Канцэрт М. Задорнава.
**18.30** СТБ прадстаўляе: Прэм'ера! «Гісторыя БССР. Кароткі курс». Дакументальны фільм, 1-я серыя.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** СТБ прадстаўляе: Вялікі калядны канцэрт «Песні года, што сыходзіць».
**22.20** Лірычная камедыя «Сем'янін». ЗША, 2000 г.
**00.35** «Крутыя рабяты». Дзённік.
**00.45** Фільм «Плачу наперад». Расія, 1999 г.

**08.15** Серыял для дзяцей «Олівер Твіст» (Вялікабрытанія-ЗША).
**09.00** Свая кампанія.
**10.05** Серыял «Спадчынніца» (Мексіка).
**10.50** Калядны прыгодніцкі мюзікл «Эні» (ЗША).
**12.25** Камедыя становішчаў «Дзіўныя каляды» (Украіна).
**14.55** Каляднае Пасланне і Благаславенне «Граду і Міру» з Ватыкана з удзелам Найсвяцейшага Папы Бенедыкта XVI.
**15.35** «Лабірынты: гаспадыня Марыя Патоцкая».
**16.05** Кіначасопіс «Жадаю ўсё ведаць» (Расія).
**16.40** Пазакласная гадзіна.
**16.55** Хакей. КХЛ. «Дынама» (Мінск) - «Хімік» (Васкрасенск). Прамая трансляцыя.
**19.15** «Нотр-Дам дэ Пары». Мюзікл (Францыя). 1-я і 2-я часткі.
**21.45** Камедыя «Зігзаг поспеху» (СССР).



**23.30** Калядная камедыя «Асцярожна, закладнік!» (ЗША).

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.10** Серыял «Вядзьмарскае каханне», 2008 г.
**10.05** Тэлесерыял «Райскія яблычкі».
**11.00** Весткі.
**11.25** Пакой смеху.
**12.25** Фільм «Калядны перапалох». 1993 г.
**14.00** Весткі.
**14.20** Фільм «Дзіўныя Каляды». 2006 г.
**16.15** «Гарадок». Дайджэст.




**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.30** «Смяяцца дазваляецца».
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.35** Серыял «Вядзьмарскае каханне», 2008 г. Заключная серыя.
**20.40** Фільм «Добрая сяброўка для ўсіх». 2008 г.
**22.40** Фільм «Танга на два галасы». 2000 г.
**00.30** «Весткі+».
**00.50** Заканчэнне эфіру.

**06.00** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**08.45** «Прафесія-рэпарцёр».
**09.10** «Залатая качка».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Жаночы погляд».
**10.50** «Іх норавы».
**11.20** Вострасюжэтны серыял «Добрыя хлопцы».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.30** Дэтэктыўны серыял «МУР ёсць МУР-3».
**15.10** «Вар'яцкі дзень. Агляд».
**15.30** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**16.00** Сёння.
**16.30** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**18.25** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.40** Дэтэктыўны серыял «Глушэц».
**21.45** «Да бар'ера!». Ток-шоў Уладзіміра Салаўёва.
**23.00** Сёння.
**23.35** «Ты смешны!». Усерасійскі конкурс народных гумарыстаў.
**00.25** Містычны дэтэктыўны серыял «Медыум».

**09.30** Вось дык так!!!
**11.00** «Формула-1». Часопіс.
**11.30** «Формула-1». Часопіс.
**12.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Нарвегіі (Трондхейм). Камандныя спаборніцтвы. HS 131.
**13.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Нарвегіі (Трондхейм). HS 131.
**14.00** Біятлон. Кубак свету ў Аўстрыі (Хахфільцэн). Жанчыны. Эстафета.
**15.00** Вось дык так!!!
**16.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Нарвегіі (Трондхейм). Камандныя спаборніцтвы. HS 131.
**17.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Нарвегіі (Трондхейм). HS 131.
**18.00** Футбол. Класіка Лігі чэмпіёнаў УЕФА. Лепшыя фіналы 1993 - 2000 гг.
**19.00** «Рэмі Гэйар». Часопіс.
**19.30** Вось дык так!!!
**21.30** Бокс.
**23.30** Аўтаспорт. Кубак Націй. Гонка Чэмпіёнаў (Лондан, Вялікабрытанія).
**00.30** Аўтаспорт. Гонка Чэмпіёнаў (Лондан, Вялікабрытанія).
**02.00** Вось дык так!!!

9

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## 26 СНЕЖНЯ, ПЯТНІЦА

**06.20** «Элаіза адна дома». Сямейная камедыя (ЗША).
**07.45** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**08.45** Гатуем разам.
**08.55, 11.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**09.10** «Ферма ў прэрыях». Прыгодніцкі анімацыйны фільм (ЗША).



**10.20** «Сірата казанская». Камедыйная меладрама (Расія).
**12.15** «Жорсткі раманс». Меладрама (СССР). 1-я і 2-я серыі.



**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.30** Жаночае ток-шоў «Жыццё як жыццё». «Позняе каханне».
**16.35** «Бацька нявесты-2». Сямейная камедыя (ЗША).
**18.40** Прэм'ера. «Самотная жанчына з дзіцем». Камедыйная меладрама (Расія).
**21.00** Панарама.
**21.40** «Усход-Захад». Драма (Францыя-Расія-Балгарыя-Іспанія).
**00.05** Чэмпіянат свету па спартыўных танцах. Частка 2-я.

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Наша раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** «Шчаслівыя разам». Камедыйны серыял.
**09.40** «Разумніцы і разумнікі».
**10.25** Камедыя «12 крэслаў».
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** «Шчаўкунок: прынц арэхаў».
**17.10** Ералаш.
**17.30** Фільм «Бедная Саша».
**19.20** Цырымонія ўручэння народнай прэміі «Залаты грамафон 2008».
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** Цырымонія ўручэння народнай прэміі «Залаты грамафон 2008». Працяг.
**23.15** «У гасцях у «Нашай Беларашы».
**00.20** Нашы навіны.
**00.35** Навіны спорту.

**07.00** Фільм-казка «Сямёра крумкачоў». Чэхія, 1993 г.
**08.25** «Казка аб залатым пеўнічку». Мультыплікацыйны фільм.
**08.55** «Залатая калекцыя»: «Вечары на сялібе блізу Дзіканькі». СССР, 1961 г.
**10.05** «Крутыя рабяты». Дзённік.
**10.15** Прыгодніцкі фільм «Гардэмарыны, наперад!». СССР, 1987 г.
**15.25** «Крутыя рабяты». Дзённік.
**15.35** «Званая вячэра».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.40** «Егіпецкія ночы». Канцэрт М. Задорнава.
**18.30** СТБ прадстаўляе: Прэм'ера! «Гісторыя БССР. Кароткі курс». Дакументальны фільм, 2-я серыя.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** Фільм «Мой лепшы сябар». Францыя, 2006 г.
**22.00** Меладрама « Беглая нявеста». ЗША, 1999 г.
**00.05** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**00.45** «Гарачы лёд».
**01.15** «Дзень даміно - 2008».

**07.10** Ранішняя падзарадка.
**08.10** Серыял для дзяцей «Олівер Твіст» (Вялікабрытанія-ЗША).
**08.55** Прыгодніцкі фільм «Белы ікол» (ЗША).
**10.45** Камедыя «Саламяны капялюшык» (СССР). 1-я і 2-я серыі.



**13.00** Шоў Ньюз.
**13.35** «Запал па культуры». Ток-шоў.
**14.15** Пазакласная гадзіна.
**14.30** Кіначасопіс «Жадаю ўсё ведаць» (Расія).



**14.50** Школа рамонту.
**15.40** «Зямля». Дакументальны фільм (Беларускае тэлебачанне).
**16.15** Усё аб бяспецы.
**16.45** Моладзевая камедыя «Зорка сцэны» (ЗША).
**18.25** Хакей. КХЛ. «Дынама» (Мінск) - «Авангард» (Омск). Прамая трансляцыя.
**20.45** Бітва экстрасэнсаў.
**21.55** Танцы без правіл.
**23.05** Камедыйная меладрама «Анатомія Грэй» (ЗША).
**00.40** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Астан Віла - Арсенал.

**07.00** Добрай раніцы, Расія!
**09.10** Серыял «Вядзьмарскае каханне», 2008 г. Заключная серыя.
**10.05** «Гарадок».
**11.00** Весткі.
**11.25** Пакой смеху.
**12.10** Камедыйная меладрама «Каханы па найманні», Расія, 2007 г.




**14.00** Весткі.
**14.20** «Смяяцца дазваляецца».
**16.50** Навіны - Беларусь.
**17.00** Весткі.
**17.30** «Юрмала». Фэст гумарыстычных праграм.
**18.50** Навіны - Беларусь.
**19.00** Весткі.
**19.35** Дэтэктыў «Апошні загад генерала». 2006 г.
**21.25** Фільм «Вандраванне ў закаханасць», Расія, 2007 г.
**23.30** Фільм «Цярновы вянок». 2007 г.
**01.00** Заканчэнне эфіру.

**06.00** Сёння.
**06.05** Інфармацыйны канал «Сёння раніцай».
**09.00** «Галоўны герой».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Хвацкія 90-я».
**10.50** «Авіятары».
**11.20** Вострасюжэтны серыял «Добрыя хлопцы».
**12.05** «Суд прысяжных».
**13.00** Сёння.
**13.30** Дэтэктыўны серыял «МУР ёсць МУР-3».
**15.20** «Вар'яцкі дзень. Агляд».
**15.30** «Агляд. Выратавальнікі».
**16.00** Сёння.
**16.30** Дэтэктыўны серыял «Вяртанне Мухтара-2».
**18.25** «Агляд. Надзвычайнае здарэнне».
**19.00** Сёння.
**19.45** «Надзвычайнае здарэнне. Расследаванне».
**20.05** «Суперстар-2008. Каманда мары».
**22.40** Біяграфічная драма «Авіятар».
**01.55** «Усё адразу!».

**09.30** Вось дык так!!!
**10.00** Артыстычны більярд. Чэмпіянат свету ў Бельгіі.
**11.00** «Формула-1». Часопіс.
**12.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Італіі (Прагелата). HS 140.
**13.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Італіі (Прагелата). HS 140.
**14.00** Біятлон. Кубак свету ў Аўстрыі (Хахфільцэн). Мужчыны. Эстафета.
**15.00** Футбол. Еўрагалы. Часопіс.
**15.30** Вось дык так!!!
**16.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Італіі (Прагелата). HS 140.
**17.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Італіі (Прагелата). HS 140.
**18.00** Футбол. Класіка Лігі чэмпіёнаў УЕФА. Лепшыя фіналы 2001 - 2008 гг.
**19.00** Футбол. Класіка Лігі чэмпіёнаў УЕФА. Олівер Кан.
**20.00** Цімберспорт. Чэмпіянат Еўропы ў Аўстрыі. Камандныя спаборніцтвы.
**20.30** Цімберспорт. Чэмпіянат свету ў Ірландыі.
**21.00** Самыя моцныя людзі планеты. Гран-пры суперсерый у Нарвегіі.
**22.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Да-1. Сусветны Гран-пры. Фінал (Токіо).
**00.00** Боўлінг. Кубак свету ў Мексіцы. Мужчыны. Фінал.
**01.00** Покер. Турнір Partouche (Францыя).
**02.00** Вось дык так!!!

## 27 СНЕЖНЯ, СУБОТА

**05.25** «Калядныя прыгоды Элаізы». Сямейная камедыя (ЗША).
**06.50** Брытва Окама.
**07.20** Існасць.
**07.45** «Добрай раніцы, Беларусь!».
**08.45** Гатуем разам.
**08.55, 14.55** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**09.05** Здароўе.
**09.40** Камедыйны серыял «Як сказаў Джым» (ЗША).
**10.15** Шпілька.
**10.50** Ранішняя хваля.
**11.30** «Будні чэмпіёнаў».
**12.10** Залатая калекцыя савецкага кінематографа. «Спортлато-82». Камедыя (СССР).



**14.05** Дакументальны фільм «Масфільм». Невядомая версія» (Расія).
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.35** «Беларускае кіно: Асацыяцыі Алега Сільвановіча». Мастацка- публіцыстычны тэлефільм (Беларускае тэлебачанне).
**16.00** Вакол планеты.
**16.40** Гульнявое шоў «Інтуіцыя».
**17.45** «Ваша лато».
**18.35** Латарэя «Пяцёрачка».
**18.50** «Вяртанне блуднага мужа». Камедыя (Украіна).
**21.00** Панарама.
**21.40** Фільм тыдня. «Сагнаць за 60 секунд». Баявік (ЗША).

**00.00** «Уласнай персонай».
**00.30** Моладзевы гумарыстычны серыял «Клава, давай!» (ЗША).

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Суботняя раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** «Шчаслівыя разам». Камедыйны серыял.
**09.40** «Здароўе».
**10.25** «Смак».
**11.05** «Кветкі як цуд». Дакументальны фільм.
**11.35** Тэлечасопіс «Саюз».
**12.05** Суботні «Ералаш».
**12.20** «Кошт поспеху Леаніда Філатава».
**13.20** Леанід Філатаў. «Пра Фядота-Стральца, заліхвацкага малайчыну».
**14.20** Чэмпіёны КВЗ. «Па-за гульнёй».
**16.00** Нашы навіны.
**16.10** Навіны спорту.
**16.15** Прэм'ера. «Прозвішча Фрэйндліх».
**17.45** АНТ прадстаўляе: «Адзін супраць усіх».
**18.50** «Ледніковы перыяд». Паказальныя выступы.
**20.00** Вялікая палітыка.
**20.30** Нашы навіны.
**21.00** Навіны спорту.
**21.05** «Ледніковы перыяд». Працяг.
**23.45** «Пражэктарпэрысхілтан».
**00.25** Што? Дзе? Калі?

**07.00** «Анфас».
**07.15** «Агенцтва 2». Камедыйны серыял.
**08.05** Фільм-казка «Пярсцёнак княгіні Ганны». Польшча, 1971 г.
**09.30** «Мая хата».
**10.00** «Крокі да поспеху».
**11.00** «Мінск і мінчане».
**11.30** «Каханне Маё». Камедыйны серыял.
**12.05** «Новыя падарожжы дылетанта».
**12.35** Музычная камедыя «Карнавал». СССР, 1981 г.
**15.30** «Відзьмо-невідзьмо». Агляд міжнароднага шоў-бізнэсу.
**16.15** «Горад дзяцінства».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.40** «Наша справа».
**16.50** «Народжаныя ў СССР».
**17.35** «Дарагая перадача».
**18.00** «Ля парáднага пад'езда».
**18.30** СТБ прадстаўляе: Прэм'ера! «Гісторыя БССР. Кароткі курс». Дакументальны фільм, 3-я серыя.
**19.30** «24 гадзіны».
**20.00** «СТБ-спорт».
**20.10** Фільм «Разумніца Уіл Ханцінг». ЗША, 1997 г.
**22.30** «Крутыя рабяты». Народнае шоў. Фінал.
**00.05** Фільм «Неба над Берлінам». Германія-Францыя, 1986 г.

**07.45** Дакументальна-пазнавальны серыял «Сардэчна запрашаем у маю краіну» (Францыя).
**08.15** Серыял для дзяцей «Олівер Твіст» (Вялікабрытанія-ЗША).
**09.00** Свая кампанія.
**10.05** Прыгодніцкая камедыя «Дэніс-кат» (ЗША).
**11.50** Школа рамонту.
**12.50** Невытлумачальна, але факт.
**14.00** «Лабірынты: стыгматычка Ванда Банішэўская».
**14.25** «Запал па культуры». Ток-шоў.
**15.10** « Касмаполітэн». Відэаверсія.
**16.20** «Спорт, спорт, спорт...».
**16.55** Хакей. Адкрыты чэмпіянат Беларусі. Керамін (Мінск) - Хімвалакно (Магілёў). Прамая трансляцыя.
**19.15** Навагодняя сямейная камедыя «Містэр Нік» (Канада-ЗША).
**21.10** Сусветны блокбастар. Прыгодніцкі баявік «Сахара» (ЗША- Іспанія).
**23.30** Шоў Ньюз.
**00.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**00.55** «Казанова». Тэлечасопіс для мужчын.

**07.00** Весткі.
**07.10** Экранізацыя рамана І.Тургенева «Бацькі і дзеці». 1983 г. 3-я серыя.
**08.25** Мультфільм. «Бегемот і сонца».
**08.40** «Мой срэбны шар».
**09.40** «Суботнік».
**10.25** «Ранішняя пошта».
**11.00** Весткі.
**11.10** Пакой смеху.
**12.00** «Вакол свету».
**13.00** Дэтэктыў «Марш Турэцкага. Новае прызначэнне». Фільм 1. «Трансфер на той свет». 1 серыя.
**14.00** Весткі.
**14.20** Фільм «Вітрына». 2000 г.
**15.50** «Смяяцца дазваляецца».
**18.00** «Новая хваля - 2008». Лепшае.
**20.00** Навагодняя камедыя «Наканаваныя пераапранутыя». 2007 г.
**22.00** Прэм'ера. «Імя Расія». Фінал.
**23.10** Камедыя «Юбілей пракурора». 2003 г.
**00.40** Заканчэнне эфіру.

**07.25** Мультфільмы.
**08.00** Сёння.
**08.15** «Казкі Бажэнава».
**08.40** Мультфільм.
**08.50** «Агляд».
**09.20** «Без рэцэпту».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Галоўная дарога».
**10.50** «Кулінарны паядынак».
**11.50** «Кватэрнае пытанне».
**13.00** Сёння.
**13.25** «Асоба небяспечны!».
**14.00** Прэм'ера. Фільм «Шлях самца».
**16.00** Сёння.
**16.25** «Жаночы погляд». «Музычна-астралагічны прагноз на 2009 г.».
**17.00** Вострасюжэтны фільм «Шпіёнскія гульні: прыватны візіт».
**19.00** Сёння.
**19.30** «Прафесія-рэпарцёр».
**20.05** «Праграма Максімум». Скандалы. Інтрыгі. Расследаванні.
**21.10** «Рускія сенсацыі». Інфармацыйны дэтэктыў.
**22.10** «Ты не паверыш!».
**23.05** Крымінальны трылер «Загана на экспарт».
**01.00** «Віктар Зінчук. Юбілейны канцэрт у Крамлі».
**02.15** «Даст іст фантасціш».

**09.30** Вось дык так!!!
**10.00** Артыстычны більярд. Чэмпіянат свету ў Бельгіі.
**11.00** Вось дык так!!!
**12.00** Лыжнае двухборства. Кубак свету ў Германіі (Оберхоф). HS 140. Прамая трансляцыя.
**12.45** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Германіі (Оберхоф). Жанчыны. 5 км. Прамая трансляцыя.
**14.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Германіі (Оберхоф). Мужчыны. 5 км. Прамая трансляцыя.
**15.15** Лыжнае двухборства. Кубак свету ў Германіі (Оберхоф). HS 140.
**15.30** Лыжнае двухборства. Кубак свету ў Германіі (Оберхоф). 15 км па сістэме Гундэрсэна. Прамая трансляцыя.
**16.15** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Швейцарыі (Энгельберг). HS 137.
**17.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Швейцарыі (Энгельберг). HS 137.
**18.00** Футбол. Класіка Лігі чэмпіёнаў УЕФА. «Манчэстэр Юнайтэд» 1998 - 1999 гг.
**19.00** Футбол. Класіка Лігі чэмпіёнаў УЕФА. Дэвід Бэкхэм.
**20.00** Вось дык так!!!
**21.00** Баявыя мастацтвы. Байцоўскі клуб. Да-1. Сусветны Гран-пры. Фінал (Токіо).
**00.00** Фігурнае катанне. Паказальныя выступы (Інгольштат, Германія).
**01.30** Спартовыя бальныя танцы. Чэмпіянат свету па лацінаамерыканскіх танцах у Аўстрыі (Інсбрук).
**02.30** Вось дык так!!!

## 28 СНЕЖНЯ, НЯДЗЕЛЯ

**06.20** Моладзевы серыял «Сэрца акіяна» (Францыя).
**06.50** «Выспа скарбаў Мапетаў». Прыгодніцкая камедыя (ЗША).
**08.30** Альманах вандраванняў.
**09.00, 12.00, 15.00** Навіны.
**09.05** «Беларусь. Гісторыя Перамогі».
**09.10** Арсенал.
**09.40** Камедыйны серыял «Як сказаў Джым» (ЗША).
**10.10** Культурныя людзі.
**10.50** Усе стыхіі.
**11.25** У свеце матораў.
**12.10** Камедыя «Беражыся аўтамабіля» (СССР).



**14.05** «Масфільм». Невядомая версія» (Расія). Дакументальны фільм.
**15.15** Навіны рэгіёна.
**15.25** Nota Bene.
**15.55** КВЗ. Фінал Еўралігі.
**18.00** Суперлато.
**19.00** «Золата Кольджата». Гісторыка-прыгодніцкі фільм (Расія).
**20.35** «Спортлато 5 з 36». Забаўляльнае шоў.
**21.00** «Панарама тыдня».
**22.15** «Пра Адама». Камедыя (Ірландыя - Вялікабрытанія).

**07.00** АНТ прадстаўляе: «Нядзельная раніца».
**08.00, 09.00** Нашы навіны.
**09.05** Нядзельная пропаведзь.
**09.20** «Шчаслівыя разам». Камедыйны серыял.
**09.55** «Шалапутныя нататкі».
**10.15** Пакуль усе дома.
**11.05** Фазэнда.
**11.40** Разумніцы і разумнікі.
**12.25** АНТ прадстаўляе: «Ранішняя пошта».
**13.05** «Казачны Эльф».
**13.55** «Хвіліна славы».
**16.00** Нашы навіны.
**16.15** Навіны спорту.
**16.20** АНТ прадстаўляе: «Міжнародная панарама».
**16.40** Тэорыя неверагоднасці. «Зараджэнне жыцця».
**17.15** Дыскатэка 80-х.
**18.25** АНТ прадстаўляе: Рэаліці-шоў «Пасаг для нявесты». Фінал.
**20.00** Контуры.
**21.05** «Апошні герой: Забытыя ў раі».
**22.20** Фільм «Законы прывабнасці».
**00.05** «Камедзі Клаб».

**07.00** «Агенцтва 2». Камедыйны серыял.
**07.50** Фільм-казка «Жамчужная дзяўчына». Чэхія, 1997 г.
**09.05** «Сабака ў ботах». Мультыплікацыйны фільм.
**09.25** «Аўтапанарама».
**09.55** «Відавочнік» прадстаўляе: самае смешнае».
**10.50** «Вялікі сняданак».
**11.30** «Каханне Маё». Камедыйны серыял.
**12.05** «Добры дзень, доктар!».
**12.40** Камедыя «Бландынка за кутом». СССР, 1983 г.
**14.10** «Паднімальнік пінгвінаў». Канцэрт М. Задорнава.
**16.00** «Культурнае жыццё».
**16.30** «24 гадзіны».
**16.50** «Уваскрэсенне класікі». Дыялогі аб музыцы.
**17.45** «Далёкія сваякі».
**18.00** «Аўтапанарама».
**18.30** СТВ прадстаўляе: Прэм'ера! «Гісторыя БССР. Кароткі курс». Дакументальны фільм, 4-я серыя.
**19.30** «Тыдзень». Інфармацыйна-аналітычная праграма.
**20.30** Фільм «Шпік». ЗША, 2007 г.
**22.20** «Спартовы тыдзень».
**22.55** «Крутыя рабяты». Вынікі 3-га сезону народнага шоў.
**23.20** Фільм «Небяспечныя гульні». ЗША, 2002 г.

**07.40** Дабравест.
**08.05** Мір вашай хаце.
**08.20** Бухта капітанаў.
**09.00** Наша пяцёрачка.
**10.05** Прыгодніцкая камедыя «Дэніс-кат зноў наносіць удар» (ЗША).
**11.30** Медычныя таямніцы.
**12.10** Пасоўванне +.
**12.25** Слова пісьменніка.
**12.55** «Спявай, душа. by».
**13.25** Жаночая ліга.
**13.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Ньюкасл - Ліверпуль. Прамая трансляцыя.
**15.55** Гіпноз.
**16.55** Хакей. КХЛ. Дынама (Мінск) - Салават Юлаеў (Уфа). Прамая трансляцыя.
**19.20** Меладраматычны серыял «Дзве зоркі» (Індыя).
**20.35** Тэлебарометр.
**20.55** Правы чалавека.
**21.10** Камедыя «Месцы ў партэры» (Францыя).
**23.15** Жаночая ліга.
**23.35** Свая музыка.
**00.20** Пасоўванне +.

**07.00** «Здабытак рэспублікі».
**07.15** Экранізацыя рамана І.Тургенева «Бацькі і дзеці». 1983 г. 4-я серыя.
**08.25** Мультфільмы. «Грышкіны кніжкі».»Вэрхал».
**08.50** «Студыя Здароўе».
**09.25** «Смехапанарама Яўгенія Петрасяна».
**10.25** «Гарадок».
**11.00** Весткі.
**11.10** «Сам сабе рэжысёр».
**12.05** Прэм'ера. «Мой ласкавы і далікатны звер. Эміль Лоцяну». Дакументальны фільм.
**13.00** Дэтэктыў «Марш Турэцкага. Новае прызначэнне». Фільм 1. «Трансфер на той свет». 2 серыя.
**14.00** Весткі.
**14.15** Фільм «Пасылка з Марса». 2004 г.
**16.45** Прэм'ера. «Зорны лёд».
**19.00** Весткі тыдні.
**20.15** Прэм'ера. Фільм «Уварванне». 2008 г.
**22.15** Фільм «Страчаны рай». 2000 г.
**00.50** Заканчэнне эфіру.

**07.00** Мультфільм.
**08.00** Сёння.
**08.15** «Дзікі свет».
**08.45** «Іх норавы».
**09.20** «Ямо дома!».
**10.00** Сёння.
**10.20** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**10.50** «Quattroruote». Праграма пра аўтамабілі.
**11.25** «Авіятары».
**11.55** «Дачны адказ».
**13.00** Сёння.
**13.20** «Крамлёўскія пахаванні».
**14.10** Камедыя «Прафесіяналы».
**16.00** Сёння.
**16.25** «Дужанне за ўласнасць».
**17.00** Вострасюжэтны фільм «Шпіёнскія гульні: уцёкі».
**19.00** «Сёння. Выніковая праграма».
**20.00** «Чыстасардэчнае прызнанне».
**20.35** «Надзвычайнае здарэнне. Агляд за тыдзень».
**21.10** «Галоўны герой».
**22.20** «Рускія не здаюцца!».
**23.00** «Наша тэма».
**23.35** Камедыя «Шоў стагоддзя».

**09.30** Вось дык так!!!
**10.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Германіі (Оберхоф). Жанчыны. 5 км.
**10.45** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Германіі (Оберхоф). Мужчыны. 5 км.
**11.30** Горныя лыжы. Кубак свету ў Аўстрыі (Семерынг). Жанчыны. Слалам-гігант. 1-я спроба. Прамая трансляцыя.
**12.15** Лыжнае дваяборства. Кубак свету ў Германіі (Оберхоф). HS 140. Прамая трансляцыя.
**12.45** Горныя лыжы. Кубак свету ў Італіі (Борміа). Мужчыны. Хуткасны спуск. Прамая трансляцыя.
**14.00** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Германіі (Оберхоф). Жанчыны. 10 км вольным стылем. Прамая трансляцыя.
**14.30** Горныя лыжы. Кубак свету ў Аўстрыі (Семерынг). Жанчыны. Слалам-гігант. 2-я спроба. Прамая трансляцыя.
**15.15** Лыжныя гонкі. Кубак свету ў Германіі (Оберхоф). Мужчыны. 15 км вольным стылем. Прамая трансляцыя.
**16.00** Лыжнае дваяборства. Кубак свету ў Германіі (Оберхоф). HS 140.
**16.15** Лыжнае дваяборства. Кубак свету ў Германіі (Оберхоф). Гонка па сістэме Гундэрсэна.
**17.00** Вось дык так!!!
**18.00** Футбол. Класіка Лігі чэмпіёнаў УЕФА. «Фейноорд» (Нідэрланды) - «Дортмунд» (Германія). Сезон 2001 - 2002 гг.
**19.00** Футбол. Класіка Лігі чэмпіёнаў УЕФА. «Чэлсі».
**20.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Германіі (Оберсдорф). Кваліфікацыя. HS 213.
**21.30** Фігурнае катанне. Паказальныя выступы (Гётэборг, Швецыя).
**23.00** Спартовыя бальныя танцы. Чэмпіянат Еўропы па лацінаамерыканскіх танцах у Расіі (Масква).
**00.00** Вось дык так!!!
**01.00** Скачкі на лыжах з трампліна. Кубак свету ў Германіі (Оберстдорф). Кваліфікацыя. HS 213.

# ШАНОЎНЫЯ ЧЫТАЧЫ!

**Газета «Новы час» распачынае падпіску на 2009 год. Падпісацца на выданне можна на перыяд ад 1 месяца да 1 года праз пошту або праз банк**

## Падпіска на «Новы час» праз пошту

1. Выразаем купон.
2. На ПАШТОВЫМ ПЕРАВОДЗЕ пішам суму грашовага пераводу ў лічбах і прописам.
3. У графе «Ад каго» пішам прозвішча, імя, імя па бацьку.
4. Ніжэй указваем адрас.
5. Ідзем на бліжэйшае паштовае аддзяленне і здзяйсняем паштовы перавод.
6. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
7. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

Министерство связи и информатизации
Республики Беларусь
№ ________ (по реестру ф. 11)
№ ________ (по реестру ф. 10)

ИСПРАВЛЕНИЯ НЕ ДОПУСКАЮТСЯ

ПРИЕМ

Предоплата за доставку г-ты "Новы час"

| Наименование предприятия связи, к - гербовая печать | Календарный шт. места подачи | № по ф. 5 | Сумма, вид услуги, подпись оператора |
|---|---|---|---|
| | | | |

ПОЧТОВЫЙ ПЕРЕВОД на ________________ руб.
________________ (сумма прописью)

Кому Куда Г-та "Новы час", р/с 3012211080010 фил. МГДОАО "Белинвестбанк", код 153001764, УНН 190790926 г. Минск, ул. Коллекторная,11

От кого ________________

Адрес ________________ (почтовый индекс и подробный адрес)

## Падпіска на «Новы час» праз банк

1. Выразаем купон.
2. Пішам прозвішча, імя, імя па бацьку і адрас.
3. Указваем суму аплаты.
4. Ідзем у адзяленне банка і здзяйсняем пералік грошай.
5. Ксеракопію плацёжнага дакумента, атрыманага вамі, з указаннем тэрміну падпіскі і адрасам дастаўкі накіроўваем у рэдакцыю.
6. Кошт падпіскі за адзін нумар — 500 рублёў (на адзін месяц — 2000 рублёў).

ИЗВЕЩЕНИЕ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)
Счет получателя 3012211080010 Лицевой счет Код 764
УНП* 190790926
________________ (фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|---|
| Период подписки указывает абонент | | | | | |
| | | | | | |

Плательщик
Пеня ________
Кассир Всего ________

КВИТАНЦИЯ

ЧИУП «Час навінаў»
(получатель платежа)
МГД ОАО «Белинвестбанк» г. Минск
(наименование банка)
Счет получателя 3012211080010 Лицевой счет Код 764
УНП* 190790926
________________ (фамилия, имя, отчество, адрес)

| Вид платежа | | | | Дата | Сумма |
|---|---|---|---|---|---|
| Период подписки указывает абонент | | | | | |
| | | | | | |

Плательщик
Пеня ________
Кассир Всего ________

ЦІКАВА

# ЮБІЛЕЙ ПРАВА НА ВЫПІЎКУ

## ЗША АДЗНАЧЫЛІ 75-Ю ГАДАВІНУ АДМЕНЫ СУХОГА ЗАКОНА

Іван БІЧ

**5 снежня 1933 года ўсе амерыканцы напружана чакалі навінаў са штата Юта. Парламент Юты вырашаў, падтрымаць ці адхіліць праект 21-й папраўкі да Канстытуцыі. Тэкст папраўкі зноў дазваляў грамадзянам набываць і ўжываць алкаголь. Ратыфікацыя праекту гэтым заходнім штатам азначала, што ініцыятыва за легалізацыю гарэлкі атрымала неабходную колькасць галасоў.**




Юта прагаласавала «за». Што тут пачалося! Цэнтры вялікіх гарадоў сталі сведкамі натуральнага шаленства. Людзі, якія ссумаваліся па моцных напоях, не шкадавалі грошай. У Нью-Йорку, як пісалі газеты, адзін капіталіст набыў у прыступе радасці порцыю віскі за 90 долараў — сума, жудасная нават па цяперашніх часах. Зразумець гэта можна: амерыканцы фармальна не пілі амаль 14 гадоў — столькі дзейнічаў сухі закон.

Ідэя забароны алкаголю ў прынцыпе не новая. Так, у Расіі сухі закон дзейнічаў з пачатку першай сусветнай вайны аж да 1925 года. У 1915 годзе забаранілі алкаголь у Ісландыі, праўда, толькі на два гады. Потым чамусьці гарэлку дазволілі, а піва — не. Яго легалізавалі толькі ў 1989 годзе. У 30-я гады алкаголь быў забаронены ў Фінляндыі.

У ЗША вайна за цвярозы лад жыцця пачалася яшчэ ў часы калоній. У 1657 годзе генеральны суд брытанскай калоніі Масачусетс забараніў продаж рому, брэндзі, віна і яшчэ шэрагу моцных алкагольных напояў. Аўтарамі гэтага праекту (як, дарэчы, і пазнейшых) былі лідэры пратэстанцкіх грамад. Яны распрацавалі цэлую тэорыю аб месцы гарэлкі ў вучэнні Хрыста. На думку пратэстантаў, паколькі гарэлка існуе, яна ёсць прадукт дзейнасці Бога. А вось негатыўны ўплыў, які яна робіць на людзей, — справа д'ябла.

У 1789 годзе ў Канэктыкуце 200 фермераў стварылі першую арганізацыю цвярознікаў у ЗША. Хутка падобныя ініцыятывы былі створаны ў кожным штаце. Сама ідэя сухога закону, аднак, узнікла толькі ў 1840 годзе сярод прыхільнікаў метадысцкай царквы. У 1850 годзе актывісты руху за цвярозасць дабіліся першай перамогі. Штат Мэн забараніў вырабляць і прадаваць алкаголь на сваёй тэрыторыі. Развіць поспех не атрымалася: грамадзянская вайна паміж Поўначчу і Поўднем зрабіла праблему не актуальнай.

Рух адрадзіўся напрыканцы 60-х гадоў XIX стагоддзя. У 1869 годзе была створана Prohibition Party (PRO) (Партыя забароны), праграмны пункт якой быў вельмі катэгарычны — татальная забарона алкаголю ў краіне.

PRO не магла канкурыраваць з вядучымі партыямі, аднак навязаць тэму была здольная. Ідэя забароны алкаголю атрымала шырокую сацыяльную базу. Натуральна, яе падтрымлівалі жанчыны, якіх дасталі п'яныя мужы. Пад ёй падпісваліся пратэстанты, якія верылі, што з-за адсутнасць пляшкі чалавек хутчэй зацікавіцца рэлігіяй. PRO падтрымлівалі сацыялісты, якім прасцей было тлумачыць вучэнне Маркса цвярозым працоўным. Як і расісты з Ку-Клус-Клана: яны верылі, што колькасць беласкурых людзей у краіне вырасце дзякуючы забароне выпіўкі. Ідэю падзялялі буйныя бізнесмены кшталту Ракфелера. Ім былі патрэбныя дысцыплінаваныя рабочыя.

У той час нават было модна фармаваць групы, якія заходзілі ў салуны, маліліся там, спявалі антыалкагольныя куплеты, галосна чыталі лекцыі. Адным словам, даставалі бармена. Апошні ў выніку падобных інтэрвенцый прыбіраў з меню назвы алкагольных напояў.

У 1881 годзе Канзас стаў першым штатам, які забараніў вырабляць у сябе алкагольную прадукцыю. Паступова тэма магчымай забароны стала часткай агульнанацыянальнага палітычнага дыскурсу. Як у асяроддзі рэспубліканцаў, так і дэмакратаў узніклі моцныя фракцыі за забарону алкаголю. У 1916 годзе кандыдат «забаронцаў» быў нават абраны губернатарам Фларыды.

Аднак сапраўдны трыумф для амерыканскіх «гарбачовых» прыйшоў у 1920-м, калі галоўнае патрабаванне цвярознікаў было выканана. Гэтаму, натуральна, садзейнічала гістарычная атмасфера. Калі ў 1917 годзе законапраект упершыню прадставілі грамадскасці, на двары стаяла першая сусветная вайна. У апанентаў ідэі не было аргументаў: час вымагаў мабілізацыі нацыі.

У 1920 годзе вайна ўжо закончылася, але затармазіць праект было немагчыма. 16 студзеня Акт аб забароне алкаголю ўступіў у сілу. Адзінымі на той момант, хто публічна яго крытыкаваў, былі медыкі. Медыцына была яшчэ не вельмі развітая, і алкаголь быў складнікам шматлікіх лекаў. Цікава, што некаторыя пратэстанцкія грамады таксама выступалі супраць забароны алкаголю. Яны лічылі, што адмова ад алкаголю павінна стаць свядомым маральным выбарам, а прымус дзяржавы не зробіць сапраўднага перавароту ў сумленні. Цяпер адзіны легальны напой у штатах быў сідр, зроблены ў хатніх умовах. Праўда, дазволены аб'ём прадукцыі напою быў абмежаваны.

Фінал пражэкту з забаронай гарэлкі аказаўся самым трагічным. Назіральнікі пісалі, што рэалізацыя ідэі сухога закону чымсьці падобнае на вынікі сацыялістычнага эксперыменту ў Расіі: думка добрая, але вынік адмоўны. Праз некалькі гадоў нават аўтары закону прызнавалі ягоны правал.

Першы вынік: людзі сталі піць яшчэ больш. Спажываць алкаголь, які стаў сімвалам чагосьці крутога, стала добрым тонам нават сярод жанчын.

Сухі закон быў дэтанатарам выбуху арганізаванага крыміналу, які заняўся кантрабандай алкаголю і яго нелегальным продажам. Так, толькі вядомы гангстэр Аль Капоне напрыканцы 20-х гадоў кантраляваў 10 тысяч (!) кафэ, якія нелегальна разлівалі алкаголь кліентам. Бандыты мелі каласальныя прыбыткі. Яны штогод тайна прадавалі амерыканцам алкаголю на 500 мільёнаў долараў. Маючы столькі грошай, гангстэры пашырылі сферы ўплыву: пачалі падкупляць суды, палітыкаў, браць пад кантроль іншыя сектары гаспадаркі. Дзякуючы сухому закону свет упершыню даведаўся слова «рэкет».

Закон аказаўся непапулярным, аднак патрэбна была вялікая дэпрэсія, якая дала падставы палітыкам для новых радыкальных ініцыятыў.

Спачатку ў кангрэсе адбыліся дэбаты наконт рэабілітацыі піва. На пачатку 30-х сапраўды піва дазволілі, аднак утрыманне спірту ў напоі мусіла быць менш за 4 градусы. І толькі 5 снежня 1933 года дазволілі продаж алкаголю якога заўгодна гатунку і моцнасці.

Праўда, 21-я папраўка пакідала за штатамі права кантраляваць гэту сферу. У выніку Місісіпі дазволіў продаж алкаголю толькі ў 1966 годзе, а Канзас да 1987-га не дазваляў прадаваць у крамах моцныя алкагольныя напоі.

Аднак нельга казаць, што эра сухога закону мела выключна негатыўныя вынікі. Парадаксальна, аднак пасля 5 снежня 1933 года ў краіне адкрылася толькі палова ад колькасці салонаў і бараў, якія працавалі да пачатку «сухіх часоў». Вялікім дасягненнем гэтай эры забароны лічыцца папулярызацыя піўной культуры, так званай «beer lager». Кліент прыходзіць у бар, каб выпіць пару кубкаў піва і паразмаўляць з сябрамі, а не напіцца як парася.

І напрыканцы яшчэ адзін цікавы факт пра сухі закон. Дзякуючы яму ў ЗША — краіне эмігрантаў — упершыню з'явіліся свае эмігранты. У 20-я гады з Штатаў эмігрыравалі вінаробы.

## ЯНЫ ПРА НАС: ЗАМЕЖНАЯ ПРЭСА ПРА БЕЛАРУСЬ

Літва, як і іншыя краіны Еўропы, таксама зацікаўленая — энергетычны дысбаланс нікому не патрэбны. Ролю беларуска-літоўскага супрацоўніцтва ўзмацняе той фактар, што Брусель адмаўляецца працягнуць тэрмін эксплуатацыі Ігналінскай АЭС. Пакуль у Літве не з'явіцца новая электрастанцыя, пастаўкі энергіі трэба будзе каардынаваць з суседзямі. Між тым, Беларусь мае намер пабудаваць сваю АЭС. Мінск, здаецца, таксама пачынае разумець, што дыялог можа быць як энергетычны, так і палітычны — гэта дыктуюць выклікі сучаснасці.

**«Geopolitika» (Літва)**

Перагляд нацыянальных законаў у адпаведнасці з нормамі ЕС, у тым ліку і ў вобласці ўжывання права (адна з умоў сяброўства ў праграме Усходняе партнёрства), па сутнасці, значыць знішчэнне ўсёй беларускай сістэмы. Фактычна ўмова «партнёрства» — адмова Беларусі ад статуса сатэліта Расіі, змена геастратэгіі. Праўда, ніякай беларускай геастратэгіі і так няма. Ёсць імітацыя будаўніцтва Саюзнай дзяржавы, пад сурдзінку якога афіцыйны Мінск атрымлівае палітычныя і эканамічныя прэферэнцыі ў Масквы.

**«Евразия» (Расія)**

Адзіным нацыяналістам Еўропы па сутнасці ёсць Бацька Лукашэнка, які ўжо 15 гадоў «разводзіць» Вашынгтон і Брусель.

**АПН (Расія)**

Не будучы ў стане прымусова знішчыць наступствы сусветнага крызісу, Аляксандр Лукашэнка загадаў хаця б пазбегнуць масавых скарачэнняў. Галоўным чынам мова ідзе пра скарачэнні працоўнага графіка, пра перавод людзей на скарочаны працоўны дзень, працоўны тыдзень, пра выхад у адпачынкі за свой кошт. Напрыклад, узяць заробак аднаго і падзяліць на двух. Ва ўмовах дзяржаўнай цэнтралізаванай эканомікі гэта магчыма. Праўда, не доўга. Таму што народ сам разбяжыцца!

**«Deutche Welle» (Германія)**

Хлусяць, трэба прызнаць, хітра і дасканала. «Беларусь звярнулася да Расіі за крэдытам», — паведамілі пасля сустрэчы Лукашэнкі і Мядзведзева ўсе праржымныя СМІ. Пры гэтым ніводнага слова пра тое, што Мядзведзеў быў вымушаны даць пазітыўную ацэнку стану беларускай эканомікі ў дні глабальных катаклізмаў. Як і тое, што крэдыт не звязаны з крызісам. Патрэба ў ім узнікла па віне расійскага боку, які груба парушыў Саюзную дамову і ўзняў кошты на газ і нафту. Аднак тыя, хто слухаў паведамленні з тэлевізару, натуральна, падумалі, што беларуская гаспадарка пацярпела ад крызісу яшчэ больш, чым наша.

**«КПРФ.Ру» (Расія)**

Думаць, што перамовы па газу паміж РБ і РФ маюць добрыя перспектывы — гэта вялікае пытанне. Як лічаць у Мінску, больш чым 160 долараў за тысячу кубаметраў ім плаціць не выпадае. Прыкладна такіх лічбаў збіраюцца яны патрабаваць. Аднак гэтыя надзеі дзіўным чынам не пасуюць разлікам Газпраму — там атрымліваецца лічба 220 долараў. Спрэчкі з Беларуссю пра кошты на газ напрыканцы снежня — такі ж абавязковы атрыбут, як навагодняя ялінка… Зараз часу засталося ў абрэз і, як кажуць у Крамлі, некаторыя саступкі Мінску будуць зробленыя, каб пазбегнуць маштабнай газавай вайны.

**«Известия» (Расія)**

## МІЖНАРОДНЫЯ НАВІНЫ

### ЗІМБАБВЕ

Улады Зімбабве абвінавачваюць Вялікабрытанію ў эпідэміі халеры, якая забрала жыцці амаль 800 чалавек, паведамляе «РИА Новости».

Улады Зімбабве звязваюць узнікненне халеры з выкарыстаннем Вялікабрытаніяй у краіне «сур'ёзнай біялагічнай і хімічнай зброі». Так, прэзідэнт Роберт Мугабэ, як заявіў яго прэс-сакратар, лічыць, што сітуацыю з халерай «спланавалі на Захадзе з мэтай уваравання».

Разам з тым, Еўрасаюз падазрае Мугабэ ў штучным стварэнні ўспышкі халеры ў гэтай краіне.

У жніўні ў Зімбабве пачалася эпідэмія халеры, цяпер гэтае захворванне ахапіла ўжо прыблізна 13 тысяч чалавек. Паводле звестак СААЗ, колькасць ахвяраў эпідэміі ў Зімбабве ўзрасла да 774 чалавек, і лічбы павялічваюцца кожны дзень. Арганізацыя абвергла заяву ўладаў Зімбабве аб тым, што эпідэмію ўдалося перамагчы.

Эканоміка Зімбабве знаходзіцца ў глыбокім крызісе. Узровень беспрацоўя дасягнуў 80 працэнтаў, а некалькі мільёнаў жыхароў краіны ўжо сталі бежанцамі. Зімбабве адчувае недахоп харчавання і паліва, насельніцтва пакутуе ад адсутнасці нармальнага медыцынскага абслугоўвання.

### ЧЭХІЯ

«Чэхі заўсёды былі прыхільнікамі адзінай Еўропы. Іх меркаванні разыходзяцца толькі ў тым, як далёка павінен зайсці працэс еўраінтэграцыі», — заявіў прэм'ер-міністр Чэхіі Мірэк Тапаланек у інтэрв'ю тэлеканалу «Еўраньюс».

Прэзідэнт Чэхіі вядомы сваім еўраскепсісам. Чэхія, да якой на першае паўгоддзе 2009 года пяройдзе старшынства ЕС, — адзіная краіна аб'яднанай Еўропы, якая не галасавала па Лісабонскім пагадненні. Рашэнне адносна пагаднення, якое павінна стаць канстытуцыяй ЕС, перанесена на люты.

Прэм'ер лічыць, што ўстаноўка амерыканскага супрацьракетнага шчыта ў Чэхіі ўскладніць адносіны з Расіяй. Пры гэтым ён выступіў за працяг перамоў з Масквой аб новым пагадненні аб партнёрстве. Тапаланек указаў на складаныя гістарычныя адносіны паміж Расіяй і Чэхіяй і падкрэсліў, што «ў інтарэсах краіны заставацца ў складзе Еўрасаюза».

### ІРЛАНДЫЯ

Прэм'ер-міністр Ірландыі Браян Коуэн пацвердзіў, што ў наступным годзе ў краіне пройдзе паўторны рэферэндум па Лісабонскім пагадненні, паведамляе «РИА Новости».

Планы Еўрасаюза па замене праекта канстытуцыі Лісабонскім пагадненнем, што вызначае прынцыпы і механізмы больш эфектыўнага функцыянавання ЕС, зайшлі ў тупік з правалам рэферэндуму ў Ірландыі. Для ўваходжання яго ў сілу неабходна ўхваленне ўсіх краін аб'яднанай Еўропы.

12 снежня лідэры Еўрасаюза на саміце ў Бруселі пагадзіліся з шэрагам саступак Ірландыі з улікам заклапочанасці ірландскай грамадскасці. У прыватнасці, у выпадку ратыфікацыі пагаднення Ірландыі будзе дадзена пастаяннае прадстаўніцтва ў Еўракамісіі ў асобе еўракамісара.

### ЛАТВІЯ

Латвія можа справіцца з наступствамі фінансавага крызісу без міжнароднай дапамогі, заявіў 14 снежня прэм'ер-міністр рэспублікі Іварс Годманіс.

«Мы знойдзем магчымасць абысціся сваімі сродкамі», — сказаў І. Годманіс. Латвія перажывае самы моцны эканамічны спад у ЕС. ВУП краіны ў трэцім квартале 2008 года ў параўнанні з тым жа перыядам мінулага года ўпаў на 4,6%.

Парламент Латвіі 12 снежня зацвердзіў урадавую праграму стабілізацыі эканомікі, што прадугледжвае павышэнне стаўкі падатку на дададзеную вартасць з 18% да 21%, а таксама скарачэнне расходаў дзяржустаноў на 15%. Апрача таго, праграма прадугледжвае зніжэнне стаўкі падаходнага падатку насельніцтва з 25% да 23%. Ёй таксама запланаваны значныя змяненні ў дзяржбюджэце краіны 2009 года. Латвія звярнулася па дапамогу да Міжнароднага валютнага фонду і Еўракамісіі.

### ЧАРНАГОРЫЯ

Кіраўніцтва краіны падало заяўку на ўступленне ў Еўрасаюз. Камісар па пашырэнні Еўрасаюза Олі Рэн вітаў гэты крок Чарнагорыі. Заяўка перададзена Нікаля Сарказі, прэзідэнту Францыі, якая старшынствуе ў Еўрасаюзе.

Олі Рэн назваў гэта «гістарычным этапам, сведчаннем цвёрдай прыхільнасці Чарнагорыі да агульных еўрапейскіх і фундаментальных каштоўнасцей».

Чэхія, да якой пяройдзе старшынства ў ЕС у першым паўгоддзі 2009 года, заявіла пра гатоўнасць падтрымаць планы Чарнагорыі па ўступленні ў ЕС.

Кандыдацкі статус дазволіць Чарнагорыі атрымліваць больш тэхнічнай і іншай дапамогі для прыёму краіны ў паўнапраўныя сябры Еўрасаюза.

### ЛІТВА

Літва можа пераадолець наступствы эканамічнага крызісу без дапамогі Міжнароднага валютнага фонду. Да такога заключэння прыйшла місія фонду ў гэтай краіне, паведамляе агенцтва «Франс Прэс».

Прэм'ер-міністр Літвы Андрыус Кубіліус пацвердзіў, што МВФ станоўча ацаніў зробленыя крокі і планы ўрада.

Як прагназуе Міністэрства фінансаў Літвы, у 2009 годзе краіну чакае сур'ёзная рэцэсія. Міністр фінансаў Альгірдас Шэмета на пасяджэнні ўрада 15 снежня паведаміў, што згодна з праектам бюджэту яго расходы ў наступным годзе перавысяць даходы на 1,496 мільярда літаў (каля 600 мільёнаў долараў ЗША).

ТЭЛЕБАЧАННЕ

# ТАЛЕРКА АПАЗІЦЫІ

Алег НОВІКАЎ

**Незалежнай беларускай тэлекампаніі «Белсат», якая вяшчае з Польшчы, споўніўся год. Хочацца пажадаць ягоным супрацоўнікам, калі не пераехаць як мага хутчэй на радзіму, то хаця б паўтарыць поспех іранскіх калегаў.**



Слова «Галівуд» выклікае ў Іране не толькі асацыяцыю са славутым цэнтрам амерыканскай кініндустрыі. «Галівуд» ва ўяўленні іранскіх улад гэта яшчэ і выклік іх манаполіі на электронныя медыя. Справа ў тым, што на Галівудскіх горках, акрамя офісаў шматлікіх кінематаграфічных кампаній, таксама месціцца студыя Нацыянальнага іранскага тэлебачання (NITV).

Канал NITV быў створаны ў 1980 годзе іранскімі палітычнымі эмігрантамі, якія пакінулі радзіму пасля ісламскай рэвалюцыі. Сярод тагачасных бежанцаў было шмат артыстаў і музыкантаў, чыя творчасць была забаронена новым рэжымам. Новы іранскі ўрад патрабаваў, каб культурная палітыка будавалася выключна на прапагандзе рэлігійных каштоўнасцей.

Адзін з іранскіх культурных дзеячаў, які апынуўся ў Каліфорніі, вырашыў, што эмігрантам (з часам іх стала ў Штатах ужо прыблізна 600 тысяч чалавек) будзе цікава глядзець ТБ на роднай мове. Ён знайшоў грошы і пачаў справу.

Канцэпцыя канала ўключала ў сябе як палітычна-аналітычны, так і забаўляльны блок. Шырокая праблематыка стала сакрэтам поспеху.

Праўда, некаторыя іранскія палітыкі ў эміграцыі лічаць, што NITV з'яўляецца агентам спецслужбаў Тэгерана. На іх думку, у сетцы ягоных перадач занадта мала палітыкі, затое зашмат музыкі, што ўсыпляе баявы тонус праціўнікаў аятолаў.

З часам канал пачаў працаваць 24 гадзіны на суткі, весці вяшчанне ў іншых краінах. Адкрыў карпункт у Лондане. Уражаныя камерцыйным поспехам NITV іншыя замежныя прадпрымальнікі іранскага паходжання таксама інвесціравалі грошы ў гэтую сферу. Сёння па-за межамі Ірана дзейнічае прыкладна 22 канала. Хаця адкрыта яны не называюць сябе апазіцыйнымі, іх дысідэнцкі імідж з-за жорсткай рэгуляцыі іранскімі ўладамі палітычнага і культурнага працэсу відавочны.

Галоўны прарыў NITV меў месца ў 2000 годзе, калі ён пачаў трансляцыі праз касмічны спадарожнік. Гэта дазволіла каналу прыходзіць у хаты іранцаў, што выклікала ў краіне не толькі новы бум набыцця спадарожнікавых антэнаў, аднак і хвалю палітычнага тэрору. Зрэшты, іранцы і раней актыўна глядзелі спадарожнікавыя каналы. Мясцовае тэлебачанне было вельмі прымітыўным.

Яшчэ ў 1994 годзе іранскія ўлады ўпершыню сутыкнуліся з феноменам пашырэння спадарожнікавых антэнаў. У выніку быў прыняты спецыяльны закон. Згодна з ім увогуле забаранялася выкарыстанне спадарожнікавых антэнаў. Фармальнай прычынай забароны стала наяўнасць у перадачах каналаў, якія вяшчалі праз спадарожнікі, элементаў распусты.

Прыняты тады закон дзейнічае дасюль і пагражае аматарам спадарожнікавых антэнаў штрафам прыкладна ў 500 долараў. Аднак да пэўнага моманту ўлады не праводзілі сістэмнага пераследу тых, хто глядзіць ТБ праз талеркі.

У сваю чаргу, у грамадстве ў адказ на ціск пачалося ўдасканаленне мастацтва знешняй маскіроўкі прыбораў. Антэны хаваюць у Іране ў нішах сцен, прыкрываюць зверху адзеннем і фанерай.

Адзін з украінскіх журналістаў, які наведаў Тэгеран сем гадоў таму, пісаў, што падчас ягонага візіту ўся сталіца была ахопленая чуткамі аб нейкім іранскім геніі інжынернай думкі. Майстар быццам прыдумаў спецыяльнае пакрыццё, якое дазваляе прыймаць ТБ-сігнал. З яго дапамогай можна глядзець спадарожнік, пафарбаваўшы гэтым рэчывам нават звычайныя вокны. Пра спецыяліста казалі таксісты, пасажыры аўтобусаў, наведвальнікі кафэ.

Аднак калі NITV перайшоў на спадарожнікавы фармат трансляцыяй, адносіны да ўладальнікаў антэнаў сталі больш жорсткія. Магчыма, на такі крок уладу падштурхнулі студэнцкія беспарадкі ў 2003 годзе. Сусветная і іранская супольнасць даведалася пра гэта з трансляцыі NITV.

З тых часоў у краіне час ад часу адбываюцца так званыя «спадарожнікавыя войны». У вялікіх гарадах праходзяць паліцэйскія рэйды: ахоўнікі парадку шукаюць і канфіскуюць антэны. Іранскі ўрад нават заявіў, што грамадзяне, якія супрацоўнічаюць з каналамі кшталту NITV, могуць быць прыцягнутыя да крымінальнай адказнасці.

Паралельна пачалася рэформа айчыннага тэлебачання. У сетцы вяшчання з'явілася больш праграм, разлічаных на моладзь і хатніх гаспадынь. Спадарожнікавыя каналы, якія распавядаюць пра навіны ў свеце моды і музыкальныя моладзевыя праграмы, — самыя папулярныя ў іранскай аўдыторыі. Парадаксальна, што ў топах папулярнасці таксама прысутнічаюць парнаграфічныя каналы, якія на Захадзе лічацца другога гатунку.

Адначасова і на дзяржаўным ТБ вырасла колькасць каналаў з двух да сямі. Нават быў дазволены пераклад і трансляцыя некаторых галівудскіх серыялаў.

Напрыканцы кастрычніка гэтага года дэпутат, сябра партыі прыхільнікаў дзеючага прэзідэнта Махмуда Ахмадзінеджада выступіў са спецыяльнай прамовай аб сітуацыі ў гэтай галіне.

Па ягоных словах, 32 працэнта іранцаў (23 мільёны чалавек) цяпер маюць некантраляваны доступ да апазіцыйных каналаў кшталту NITV праз спадарожнікавыя антэны.

У выніку ягонага выступу ў парламенце пачаўся разгляд закона аб пакаранні для тых, хто хавае антэны. Цяпер іх, магчыма, будуць караць штрафам у 50 мільёнаў рыядаў — 5500 долараў ЗША. Натуральна, грамадзянам у чарговы раз прапанавалі праявіць сумленне і самім адмовіцца ад параджэння Сатаны — спадарожнікавых антэнаў.

Затое на Захадзе лічбы, названыя парламентарыем, выклікалі фурор у лідэраў апазіцыі. Нават самыя вялікія аптымісты не думалі, што аўдыторыя спадарожнікавых апазіцыйных каналаў такая вялікая. У іх дакладах фігуравала лічба ў 3–4 мільёны. Каментуючы сітуацыю, дырэктар аднаго замежнага апазіцыйнага ТБ заявіў, што ў бліжэйшыя гады абсалютна рэальна ахапіць сеткай вяшчання апазіцыйных студый да 90 працэнтаў іранцаў.

НЕТРАДЫЦЫЙНА



# СВЯТАРЫ, ЯКІЯ СПЯВАЮЦЬ

Алег НОВІКАЎ

**Слова «святар» звычайна выклікае ў свядомасці асацыяцыі з сумнымі царкоўнікамі, што чытаюць біблейскія тэксты або моляцца. Час забыць пра старыя клішэ. Гурт святароў-спевакоў з Паўночнай Ірландыі штурмуе вяршыні музычных хіт-парадаў.**

«Святары», або на ангельскай мове «The Priests», — музычны гурт сапраўдных святароў з горада Дэрбі (Паўночнай Ірландыя). Склад гутра: айцец Яўген О'Хаган, айцец Марцін О'Хаган і айцец Давід Дэлагры. Усе яны фактычна аднагодкі: Марціну — 45, Яўгену — 48, а Дэвіду — 44 гады. Яшчэ ў дзяцінстве, калі ім было пад дзесяць, яны пачалі ў школе спяваць разам. Потым працягнулі спяваць у каледжы, дзе за заўзятую цікавасць да каталіцызму аднакласнікі клікалі іх «святая тройца». Не пакінула тройца хобі і пасля таго, як кожны з іх атрымаў святарскі сан.

Прыблізна гадоў дваццаць яны спявалі санеты і гімны для наведвальнікаў маленькага храму ў Дэрбі і нават не думалі, што ў адзін цудоўны дзень музыка перакуліць усё. Аднойчы іх абсалютна выпадкова пачуў нейкі прафесійны музыка і пераканаў святароў дасласць дэманстрацыйную версію ў музычную кампанію SonyBMG. Святары зрабілі запіс, хаця раней ніколі не бачылі нават студыйных мікрафонаў. Вынік быў ашаламляльны.

Кіраўніцтва SonyBMG нечакана прапанавала святарам кантракт на два мільёны долараў. Прадзюсерам святароў пагадзіўся стаць Майк Хеджэс, які ў свой час раскручвай славуты гурт «U2». Дададзім, што Майк — быў панк-анархіст, які ў маладосці ставіўся да рэлігіі вельмі адмоўна. Яшчэ да дня першага рэлізу альбом стаў сенсацыяй. Дастаткова сказаць, што альбом адразу паступіў у продаж у 33 краінах. Акрамя таго, адна амерыканская кампанія зняла напярэдадні выхаду альбому дакументальны фільм пра калектыў.

Трэба прызнаць, што ў SonyBMG працуюць сапраўдныя прафесіяналы сваёй справы. Альбом з запісамі песняў святароў прадаецца як гарачыя пірагі. На днях кампанія Guinness World Record, якая займаецца маніторынгам музычнага рынку, прысудзіла «The Priests» прэмію ў намінацыі «Самы лепш прадаваемы дэбютны альбом». Не апошнім фактарам поспеху альбому было і рашэнне кіраўніцтва Ватыкану дазволіць гурту запісаць некалькі песняў у базіліцы святога Пятра ў Рыме. Уладальнік кампаніі SonyBMG кажуць, што з улікам рынку пірацкіх дыскаў «The Priests» — адзін з самых папулярных гуртоў года як мінімум на рынках каталіцкіх краін, дзе пражывае больш за мільярд чалавек.

Цікава, як самі музыкі ставяцца да свайго трыумфу. Яны катэгарычна адмаўляюцца ад ганарараў ад продажу дыску. Усе грошы пераводзяцца на рахункі філантрапічных арганізацый. Акрамя таго, пры падпісанні кантракту з SonyBMG святары паставілі ўмову: рознага кшталту канцэрты, запісы і прэзентацыі не павінны ламаць графік іх царкоўнай службы. «Мы былі і будзем святарамі. Гэта праца грэе нам сэрцы», — кажа айцец Марцін.

Царкоўнікі, калі аналізуюць свой нечаканы поспех, кажуць, што іх музычная кар'ера ёсць напэўна праява Божай волі. Адзін са святароў перад тым, як прыняць рашэнне падацца ў камерцыйны праект, доўга маліўся і шукаў парады ў тэалагічных працах. Апошнім штуршком пагадзіцца на прапанову SonyBMG сталі словы Папы Яна Паўла II, які неяк казаў пра значэнне для касцёла пашырэння папулярнасці царкоўнай музыкі. Так ці інакш, з'яўленне «The Priests» на музычным рынку пашырыла магчымасці Ватыкану выходзіць на моладзь. Падчас розных інтэрв'ю, якія перадаюць папулярныя сярод моладзі каналы, святары кажуць пра грэх аборту або аспрэчваюць дурны міф нібыта кожны царкоўнік педафіл.

Тэзіс пра тое, што «The Priests» — промысел Божы, некаторым чынам падзяляюць і прафесійныя прадзюсеры гуртоў. «Ці мае нехта са святароў шанец стаць новым Фрэнкам Сінатрам або Элвісам Прэслі? Абсалютна не, — кажа адзін з іх. — Аднак дзіўным чынам іх музыка і яе змест фантастычна пасуюць гістарычнай атмасферы». На яго думку, святары сваімі песнямі ствараюць нейкую эмацыйную гармонію паміж асобай і наваколлем. Якраз гэтага сапраўды надзвычай часта не хапае людзям.

Паколькі першы блін аказаўся не комам, самі святары будуюць грандыёзныя планы. Адзін з іх нават заклікаў ідала папулярнай культуры спявачку Брытні Спірс рыхтавацца да пенсіі. Ён пaабяцаў, што рэйтынг Брытні хутка ляснецца на хвалі папулярнасці «The Priests», што ўвесь час расце. Магчыма, гэта было сказана ў якасці жарту, але ж, магчыма, што і не...

**Кіраўніцтва SonyBMG прапанавала святарам кантракт на два мільёны долараў. Прадзюсерам святароў пагадзіўся стаць Майк Хеджэс, які ў свой час раскручвай славуты гурт «U2»**

## ПАЛІТЫКІ ТЫДНЯ



### ГОРДАН БРАЎН

Прэм'ер-міністр Вялікабрытаніі, лідэр партыі лейбарыстаў, моцна пасварыўся з Берлінам. Прычына — словы фінансавага міністра Германіі Пітэра Штэйнбрука. У адным з інтэрв'ю ён назваў кіраўніка кабінету Яе Вялікасці «тупым кейнсіянцам» (Джон Кейнс — вядомы брытанскі эканаміст, які падчас крызісу 20–30-ых гадоў, выступаў за дзяржаўнае рэгуляванне). Падставай параўнаць Кейнса і Браўна стала рашэнне Даўнінг Стрыт, 10 выдзеліць дваццаць мільярдаў фунтаў на падтрымку брытанскай эканомікі. Выраз Штэйнбрука не спадабаўся Лондану і амаль выклікаў дыпламатычную вайну: пасол Вялікабрытаніі ў Берліне патэлефанаваў кіраўніку нямецкага МЗС і выказаў сваё незадавальненне. На думку брытанскага ўраду, у немцаў няма ніякіх прычын лічыць Браўна заўзятым антылібералам. У якасці аргумента пасол спасылаецца на рашэнне Еўрасаюзу выдзеліць на падтрымку кантынентальнай гаспадаркі аж 200 мільярдаў еўра. Лондан звяртае ўвагу Берліна на тое, што складанай часткай крытыкі торы на адрас Браўна ёсць таксама антыеўрапейскія лозунгі. Так, кансерватарам не падабаецца рашэнне Браўна падтрымаць уключэнне Харватыі ў ЕС у 2010 годзе.

### АЛЬВАРА УРЫБЭ



Прэзідэнт Калумбіі пад уплывам перамогі Барака Абамы на выбарах прэзідэнта ЗША вырашыў перапісаць гісторыю краіны. Па заказу дзяржавы гісторыкі пачалі архіўныя пошукі — які колер скуры на самай справе меў Віктар Макера Шау —калумбійскі палітык сярэдзіны XIX стагоддзя, які нават адзін час быў прэзідэнтам. Адпаведна некаторым крыніцам, Віктар быў чарнаскурым. Эліце краіны, якая галоўным чынам складалася з белых, было сорамна за такі факт, і праз нейкі час было вырашана выкрасліць імя Віктара са спісу калумбійскіх прэзідэнтаў. У краіне нават былі забароненыя арыгінальныя партрэты Віктара. Усе яны былі адрэтушаваныя. Віктар выглядаў на іх з белай скурай. Аднак планы фальсіфікатараў гісторыі праваліліся. Нейкім чынам адзіны партрэт, на якім выяўлены чарнаскуры Віктар, трапіў у Парыж. Сёння гэтая фатаграфічная картачка дазваляе калумбійцам ганарыцца тым, што іх краіна ў галіне расавай талерантнасці, магчыма, абагнала ЗША прыблізна на 150 гадоў.



### ВІКТАР ЮШЧАНКА

Прэс-служба ўкраінскага лідэра заявіла пра адмену прэс-канферэнцыі ў інтэрнэце, якая планавалася на 16 снежня. Афіцыйная падстава — у прэзідэнта вельмі шчыльны графік. Між тым, большасць экспертаў лічаць, што Юшчанка проста збаяўся. Справа ў тым, што кіраўніку Украіны давялося б адказваць на пытанні, якія ставяць карыстальнікі сеціва. Аднак самыя рэйтынгавыя пытанні наўрад ці выклікаюць задавальнення ў Юшчанкі. З вялікім адрывам фігуруе пытанне: «Колькі трэба заплаціць прэзідэнту, каб ён разам з усімі дэпутатамі, міністрамі і чыноўнікамі з'ехаў за мяжу і не замінаў Украіне нармальна развівацца?» Адказ на яго жадалі пачуць 53 тысячы чалавек. Таксама ў лідэрах пытанне пра дэпутата Рады, які, будучы п'яным, у Роўна наехаў на сваёй машыне на маленькую дзяўчынку. Дзяўчынка загінула, а забойца дасюль на свабодзе. «Калі вінаваты нарэшце будзе за кратамі?» — хорам пытаюць восем тысяч украінцаў. Прыкладна столькі юзераў спыталі: «З якога боку прэзідэнт любіць есці шакаладныя рагалікі?» У прэзідэнта таксама часта цікавяцца: «Куды лепш эміграваць з Украіны?» Дарэчы, у мінулым годзе пытанні да падобнай прэс-канферэнцыі былі больш мяккімі. Кшталту: «Як прыладзіць KDE2 пад аперацыйную сістэму FreeBSD?».

ІМПРЭЗА

# ДЗЕНЬ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА

Аляксей Хадыка

**Ефрасіння Полацкая, Анастасія і Сафія Слуцкія, слуцкія ж ткачыхі, Паўлінка — вобраз Беларусі праз стагоддзі настолькі рэгулярна ўвасабляўся як вобраз жаноцкі, што пераўтварэнне аднаго з аўтараў гэтых увасабленняў, Максіма Багдановіча, паэта «(не)-самотнага» і задуменнага, метадам містэрыяльнага прачытання і сіламі акторкі-выкаўнаўцы аднаго з гэтых жаночых вобразаў (Анастасіі), акторкі Купалаўскага тэатра Святланы Зелянкоўскай, выглядала амаль як заканамернасць.**





Тым больш, што славутае Багдановічаўскае «Біце ў сэрцы іх, біце мячамі!» — тэма патрыятычнага закліку да мужчын-змагароў, пасланых на бой са здраднікамі Радзімы (якая таксама прагучала ў спектаклі-містэрыі) — класічная літаратурная тэма звароту да сваіх мужчын з боку сясцёр-жонак-маці, якія выпраўляюць братоў-мужоў-сыноў на вайну. Зноў жаночы голас на сцэне.

У кожным разе тое, што адбывалася 10 снежня ў Вялікай залі Белдзяржфілармоніі, на наступны дзень пасля 117-годдзя ад нараджэння паэта, і што называлася містэрыя «Дзень Максіма Багдановіча» — праект Ларысы Сімаковіч, — было нечым не зусім звыклым. Таму і атрымала зусім розныя водгукі. Ад «найважнейшая музычная падзея Беларусі за ўвесь 2008 год» і «пастаноўка з тых, якія складаюць актуальны фонд нацыянальнай культуры кожнай краіны» (Кірыл Барысенка, «Белгазета»). Да водгуку, у якім адбілася адваротная крайнасць: «Неадназначна людзі ставіліся да прэм'еры. Некаторыя выказваліся, што чакалі іншага, і задумка аўтара наблізіць навелы да творчасці Максіма Багдановіча яму не ўдалася» (радыё «Свабода», Любоў Лунёва).

Разам з вершам паэта 1915 года, які дае прачытанне задумы спектаклю, хацелася б працытаваць рэцэнзію «Нашай нівы» (Павал Касцюкевіч): «Рэчаіснасць выявілася бляднейшай у параўнанні з узвівам фантазіі і нейк так сарамліва схавалася ў прыпечку. Зазвычай надакучлівая зязюля гэтым разам зрабіла выгляд, што яна страус. Усе гадзіннікі спыніліся, і цыферблаты сцяклі долу. Гэта нагадвала вырай, як яго апісваюць у марах.

*Я хацеў бы спаткацца з Вамі*
*на вуліцы*
*У ціхую сінюю ноч*
*І сказаць:*
*«Бачыце гэтыя буйныя зоркі,*
*Ясныя зоркі Геркулеса?*
*Да іх ляціць наша сонца,*
*І нясецца за сонцам зямля.*
*Хто мы такія?*
*Толькі падарожныя, —*
*папутнікі сярод нябёс.*
*Нашто ж на зямлі*
*Сваркі і звадкі, боль і горыч,*
*Калі ўсе мы разам ляцім*
*Да зор?»*

Напэўна, ва ўсіх водгуках адбіліся асаблівасці містэрыі як формы ўздзельнічаць на свядомасць і фантазію гледачоў. Увасобленыя ў вельмі розных музычных, сцэнічных, тэатральных і нават поп-культурных жанрах пачуцці, думкі і перажыванні могуць быць прачытаныя гледачом, а могуць не супасці калі не з яго культурным кодам, то хоць бы з настроем і чаканнямі сённяшняга вечара. У апошнім выпадку ўзнікае адчуванне падманутых спадзяванняў.

Так ці інакш, у кліпава-калейдаскапічнай манеры аўтар пастаноўкі імкнулася спалучыць разам і ўвасобіць «Багдановічаўскія» матывы і рэфлексіі праз гендэрна мадэрнізаваны тэатр, класічнай формы музыку ўласнага сачынення Ларысы Сімаковіч у выкананні «Класік-авангарда», фальклорныя кампазіцыі тэатра «Госціца», нумары хард-рокавай групы In Search For (і Яна Жанчака), гурта «Ліцвінскі хмель», дзявочага рэп-трыа і Лявона Вольскага з «N.R.M.» у ролі саміх сябе.

Цікава, як уласныя пераўвасабленні або адсутнасць апошніх пракаментавалі ўдзельнікі пастаноўкі.

«Як акторка я б магла сыграць каго заўгодна, але павінна быць прычына. І тут яна ёсць, — пракаментавала сваю ролю Святлана Зелянкоўская. — Тут няма такога акцэнту, што Багдановіча грае жанчына. У мастаку і паэту сумяшчаецца як жаночае, так і мужчынскае».

Гурт «N.R.M.», наадварот, быў здзіўлены прапанаваў выступіць у містэрыі ў вобразе саміх сябе і зайграць са сцэны «дзяжурныя» кампазіцыі «Лёгкія-лёгкія» і «Тры чарапахі».

Музыка Піт Паўлаў распавёў у інтэрв'ю радыё «Свабода»: «У нас расійскі тэлевізар, нам расійская ментальнасць навязваецца на дзяржаўным узроўні, у нас прапагандуюць нейкіх расійскіх зорак. У нас цяпер не з'яўляюцца ні зоркі спорту, ні зоркі мастацтва, ні зоркі паэзіі… На жаль, апошнія гады не даюць зорак ні ў якай галіне. «N.R.M.» падрыхтаваў дзве песні на вершы Максіма Багдановіча да праекту, але высветлілася, што ў праекце «N.R.M.» патрэбны ў якасці культуралагічнай з'явы».

Так бы мовіць, альтэрнатыўная расійскай папсе ўсучасненая «зорка Максіма» на рокавай сцэне.

Такім чынам, гледачы ўбачылі дзевяць навел-містэрый, выкананых у розным музыка-рытмічным і пластычным ключы, звязаных з творчасцю Максіма Багдановіча, яго вершамі або з успамінам пра яго — у душы і сэрцы. А вобразам Максіма зрабілася Святлана Зелянкоўская. «Чым не твар сучаснай Беларусі?» — запыталася «Наша ніва», заўважыўшы яе выгаднае адрозненне ад іншых (папсовых) твараў, якія навязваюцца публіцы апошнім часам.

Навелы-містэрыі — «Дождж», «Пачатак краю», «Край русалак» — былі пра дзяцінства і ўспаміны, укаранёныя ў памяці з казак, песень, дзіцячых гульняў. «Каханне» — юначая палымяная лірыка. «Крыж», «Прысуд» — увасабленні грамадзянскай пазіцыі, патрыятычна-гнеўны зварот праз дзесяцігоддзі да сучаснікаў, якія адцураліся сваёй нацыянальнай культуры.

Ларыса Сімаковіч выказала меркаванне, што калі не свядома, то на падсвядомым узроўні беларускаму гледачу абрыдлі заезджыя «пракоі», за якіх ён плаціць немалыя грошы: «На нашай зямлі хапае пракоў». Паводле задумы аўтаркі, паэт праходзіць праз дзевяць навелаў-містэрый разам з персанажамі сваіх вершаў — русалкамі, вадзянікамі, лесунамі. У кожным акце свае героі, прычым зусім нечаканыя. Багдановіч сустракаецца з Моцартам і Сальеры, вулічнымі рэп-выканаўцамі, рэжысёрам Пінігіным. Іншымі словамі, у бальшыні эпізодаў памяць Максіма Багдановіча ўвасабляецца тымі, пра каго можна было б сказаць — «Максім Багдановіч ёсць у іх у душы». І гэта — генеральная лінія містэрыі.

Цікава, што Ларыса Сімаковіч мяркуе: падобныя пастаноўкі не могуць быць серыйнымі. То бок прапаноўвацца па некалькі прагонаў на камерцыйнай аснове спектакль не павінен. Зразумела, супрацоўнікі філармоніі, магчыма, яшчэ не хутка супакояцца, пачуўшы на «святой» класічнай сцэне жвавыя акорды і гучныя дэцыбелы In Search For і «N.R.M.» (Як заўважыў выходзячы са спектаклю вядомы мастак Алесь Пушкін: «Можа ў лесе нешта здохла, калі Лявон Вольскі грае на сцэне філармоніі?») Але аншлагавасць прэм'еры падказвае: чаму б не паспрабаваць, насуперак складанасці ўвасаблення задумы і арганізацыі ўсяго праекта, зрабіць паўтор? Хоць бы да 120-годдзя паэта (2011) або 100-годдзя яго «Слуцкіх ткачых» (2012), якія ў «метал-рокавым» варыянце ў выкананні In Search For прагучалі ў фінале містэрыі?

І на заканчэнне: «Дзень Максіма Багдановіча» адбыўся ў рамках кампаніі «Будзьма!».



ВЫСТАВА

# ARS INCOGNITA

Сяргей ГВАЗДЗЁЎ

**16 снежня ў выставачнай зале Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору адкрылася выстава «ARS incognita», што складаецца з малавядомых твораў мастакоў Заходняй Беларусі, прадстаўнікоў Віленскай школы. Суквецце імёнаў мастакоў, чые творы прадстаўлены ў экспазіцыі, уражвае гледачоў.**

Тут і брэнд Беларускага Адраджэння Я. Драздовіч, і патрыярх заходнебеларускага мастацтва П. Сергіевіч, і знаны жывапісец ды выдатны графік М. Сеўрук, чый унёсак у мастацтва да гэтага часу цалкам не ацэнены. Тут таксама менш бачаныя і знаныя гледачом С. Вішнеўскі, Зм. Крачкоўскі і зусім неспазнаныя, але ад гэтага яшчэ больш цікавыя графік В. Сідаровіч (быў знішчаны органамі НКВД у 1937 годзе ў Чэлябінску) і жывапісец П. Южык.

Больш за 100 твораў жывапісу і графікі з прыватных калекцыяў — па-сутнасці першая і досыць удалая спроба панарамнага агляду неабжытай заходнебеларускай спадчыны. Зразумела, што арганізатары імкнуліся паказаць калі не ўсё, дык як мага больш. Гэта трошкі ўскладняе ўспрыманне, але і стварае дадатковую мажлівасць думнаму і ўражліваму гледачу адчуць своеасаблівы і непасрэдны дыялог паміж работамі — жанравы, тэматычны, стылёвы. Выстава унікальная яшчэ і тым, што апрача алейных партрэтаў і краявідаў, кампазіцыяў, эцюдаў, малюнкаў алоўкам, узораў друкаванай графікі на ёй можна пабачыць святую святых мастака — рабочыя накіды да твораў, эскізы касцельных роспісаў. Экспазіцыя шчодрая на адкрыцці, і таму, мы ўпэўнены, яна выкліча жывую і непадробную цікаўнасць сапраўдных аматараў мастацтва.

Падзеяй выстава «ARS incognita» станецца і для адмыслоўцаў-мастацтвазнаўцаў, даследчыкаў нацыянальнай гісторыі і культуры. Бо яна яшчэ раз пацвярджае, што ў Заходняй Беларусі існавала, хаця і «неаднародная», але адметная і шырокая мастацкая плынь. А яшчэ выстава правакуе шукаць, вывучаць і паказваць творы не толькі віленчукоў (Горыд, Рамановіч, Чурыла, Кучынскі, Дабржынскі, Жынгель ды інш.), але і другіх мастакоў Заходняй Беларусі, якія навучаліся ў іншых школах (Паўлючук, Лазіцкі, Лаўроў, Хруцкая, Карніцкі, Рамашкевіч і інш.)

Адкрыццё новых імёнаў, вяртанне іх у культурны кантэкст і грамадскую свядомасць, збіранне парэшткаў духоўнай спадчыны апрача ўласнамастацкай вартасці, мае дакументальную і гісторыка-культурную значнасць. Дапамагае ўсвядоміць, што мы страцілі, якія рысы адметнага нацыянальнага твару былі сцёртыя пад таталітарным скрабком. Як стала прырастаць да твару беларуса накінутая маска руска-савецкай культуры, прыўкрашаная элементамі «мясцовага каларыту».

Выстава не толькі актывізуе да спазнання і засваення спадчыны, але і стымулюе трапяткое і ўважлівае стаўленне да мастака сённяшняга, разуменне эстэтыкі яго творчасці, змушае да сур'ёзных роздумаў.

Арганізатары гэтай цудоўнай імпрэзы — творчае грамадскае аб'яднанне «Мастак», галерэя «Добрыя Мыслі». На жаль, выстава працуе толькі дзесяць дзён. Спяшайцеся наведаць.

РЭЦЭНЗІЯ

# СВЯТА ПЯТРА І ПАЎЛАЎ

Ева ВАЙТОЎСКАЯ

**Надышоў час пазвальняць усіх беларускіх літаратараў за профнепрыдатнасць. Самыя гучныя кнігі пачатку зімы выдалі палітыкі: Павел Севярынец напісаў кнігу пра любоў, Пётр Садоўскі паставіў «балет Мойшы», а спадар пасол Ізраілю Зээў Бен-Ар'е скончыў сваю місію ў Беларусі прыемным сюрпрызам для аматараў літаратуры.**




## ЖЫВАЯ МОВА ФРУКТАЎ

**Чалавек, які скраў Сьцяну Плачу: 15 ізраільскіх апавяданьняў у перакладах Паўла Касцюкевіча. — Мн.: Логвінаў, 2009.**

Малады беларускі літаратар і журналіст Павал Касцюкевіч — двойчы герой ізраільска-беларускай дружбы. У 2006 годзе пасольства дзяржавы Ізраіль прэзентавала першую кнігу яго перакладаў з іўрыту — «Кіроўца аўтобуса, які хацеў стаць Богам», зборнік апавяданняў выбітнага ізраільскага пісьменніка Этгара Керэта. І вось праз два гады — новы падарунак чытачу. 11 снежня ў ізраільскім культурным цэнтры адбылася прэзентацыя зборніка апавяданняў «Чалавек, які скраў Сцяну Плачу».

«Гэта кніга зробленая з вялікай любоўю!» — цешацца яе першыя чытачы. Гэта бачна па тым, як яна ўкладзена. Нестандартныя ўступы прадстаўляюць нам аўтараў дзвюх генерацый — «маладзейшай» і «старэйшай», зборнік мае ажно дзве прадмовы — ад перакладчыка і ад фундатара, Зээва Бен-Ар'е. Спадар пасол, згадваючы пра тое, як габрэі фактычна з нуля адрадзілі іўрыт, з гонарам зазначае, што цяпер гэта гутарковая мова з усімі магчымымі стылямі: ёй карыстаюцца і заўзятары на стадыёне, і падлеткі на дыскатэцы, і прафесары падчас лекцый. Уся гэта разнастайнасць патрабуе жывога і адпаведнага перакладу на беларускую мову. «Праўдзівы дыялог ізраільскай і беларускай культураў можа весціся адно на нацыянальных мовах — іўрыце і беларускай», — зазначае дыпламат.

«Каб перакладаць, мне не трэба было корпацца ў слоўніках, карысней было выйсці на вуліцу, паслухаць жывую размову прадавачкі фруктаў з пакупніком,» — прызнаўся падчас прэзентацыі Павал Касцюкевіч. Рабіў ён гэта, стоячы перад публікай на адной назе: у іўрыце ёсць выраз «гаварыць на адной назе», гэта значыць, сцісла і па сутнасці. У сваёй прадмове ён у некалькіх старонках спрабуе пераказаць нам гісторыю сучаснай літаратуры Ізраілю. Касцюкевіч мае сваю візію кароткага апавядання — яго любімага жанру. «Сучасныя ізраільскія пісьменнікі, — тлумачыў ён, — спрабуюць завабіць чытача кідкімі інтрыгоўнымі назвамі, нестандартным пачаткам — усё, як у журналістыцы. І разам з тым іх апавяданні — не аднадзёнкі, у іх ёсць надзвычайная глыбіня».

У прэзентацыі было адно слабое звяно. Чытаць перакладную прозу быў запрошаны прафесійны актор, малады зорка беларускай сцэны, які да жаху кепска даў сабе рады з творчым заданнем. Нават калі б да нас не даходзілі чуткі пра скандалы, якія скаланаюць Купалаўскі тэатр, ужо па адным гэтым чытанні можна было даўмецца, што на беларускіх падмостках усё кепска. Бо пасля «прафесіянала» на сцэну выйшаў «аматар» — герой вечара Павал Касцюкевіч — і бліскуча прачытаў тэкст ужо са зборніка сваіх апавяданняў «Душпастырскія спатканні для дачнікаў» з серыі «Кнігарня «Наша ніва». Гэтая кніга па праве лічыцца ці не найяскравейшым дэбютам у сучаснай беларускай прозе. Як і пераклады Паўла, яна паўстала на жыццядайным міксе беларускіх і габрэйскіх культуры і штодзённасці.

На паліцы ў рэдакцыі НЧ цяпер ёсць кніга з аўтографам: «Яшчэ адзін пераклад ізраільскай літаратуры на беларускую мову. Ужо не дзівота, а добрая традыцыя. Развітальны падарунак Зээва Бен-Ар'е на пасадзе пасла Ізраілю ў Беларусі». «Дзякуй усім, з кім я пазнаёміўся цягам гэтых год працы. Нават калі гэта знаёмства адбылося завочна — праз кнігі, творчыя сустрэчы, спектаклі… Гэта вельмі важна для мяне», — такімі словамі спадар пасол развітаўся з беларускай творчай інтэлігенцыяй.

## У ПОШУКАХ ШЫБАЛЕТУ

**Пётр Садоўскі. Мой шыбалет. Аўтабіяграфічныя арабэскі. (Бібліятэка Свабоды. XXI стагодзьдзе). — Радыё Свабодная Эўропа / Радыё Свабода, 2008.**

12 снежня Радыё «Свабода» — адзінае, відаць, радыё, чый эфір раз-пораз канвертуецца ў мастацкія выданні — прадставіла 15-ю кнігу ў сваёй калекцыі, аўтабіяграфічны «Мой шыбалет» Пётры Садоўскага. Зірнуўшы на вокладку, чытач, схільны да каламбураў, убачыць на ёй той самы «Мойшы балет», які спачатку пабачылі мы. Сэнс назвы і сапраўды звязаны з гарбрэйскім кантэкстам, але значна менш папсовым чынам. Слова шыбалет (shibboleth) паходзіць з Бібліі, з Кнігі Суддзяў: «І перахапілі Галаадыцяне пераправу цераз Іардан у Яфрэмавых, і калі хто з ацалелых Яфрэмавых казаў: «дазвольце мне пераправіцца», дык жыхары Галаадскія казалі яму: ці не Яфрэмаў ты? Той казаў: не. Яны казалі яму: «скажы: «шыбалет», а ён казаў: «сыбалет», і не мог інакш вымавіць. Тады яны, узяўшы яго, заколвалі каля пераправы цераз Іардан. І загінула тым часам з Яфрэмавых сорак дзве тысячы». Слова «шыбалет» (у перакладзе — «плынь» або «колас») увайшло ў мовы свету ў значэнні «моўны пароль», характэрная асаблівасць, па якой можна зразумець, да якой этнічнай групы належыць носьбіт мовы. Лінгвіст і дыпламат Пётра Садоўскі ў інтэрв'ю Радыё «Свабода» тлумачыць: «Я шукаю беларускі шыбалет, што ёсць мы сярод усяго чалавецтва».




Гэта першая кніга Садоўскага. Кніга-бальзам на раны старэйшаму пакаленню і навука маладзейшаму. Бо, пагадзіцеся, рэдка ў адной асобе сыходзіцца чалавек, які жыве насычаным жыццём, і чалавек, здольны ўсё гэта захаплялльна апісаць. «Мой шыбалет» — мемуары, памножаныя на эсэістыку.

І яшчэ адзін ключ прыадчыняе сакрэт цікавасці інтэлігентнага чытача да гэтай кнігі. Пётра Садоўскі — увасабленне таго самага філосафа на троне, аб якім марыць адукаваны грамадзянін і які, па многіх сацыякультурных прычынах, немагчымы ў нашай краіне. Пачатак 1990-х — той час, калі Беларусі прыпала некалькі год улады інтэлектуалаў, пра што цяпер многія згадваюць з настальгіяй. Калі б… Калі б… Садоўскі — прадстаўнік тых элітаў, дэпутат Вярхоўнага Савету 12-га склікання. Сучасны дэмакратычнай моладдзю той час успрымаецца як перыяд герояў з кнігі «Міфы і легенды старажытнай Грэцыі». Неадночы чутая показка пра Садоўскага: першы пасол незалежнай Беларусі ў Нямеччыне, ён выйграў конкурс сярод дыпламатаў, назваўшы максімальную колькасць нямецкіх прыказак і прымавак. Дальбог, гэты чалавек здзейсніў бы яшчэ 11 подзвігаў, калі б… Калі б…

І разам з тым кніга «Мой шыбалет» — інтымна-шчымлівая. Гэта «споведзь» аўтара, яго «распрананне перад чытачом». Няйзіва, што падчас прэзентацыі кнігі сядзіба БНФ была перапоўненая.

## ДЗВЕСЦЕ ЛЮБОВЯЎ СЕВЯРЫНЦА

**Павал Севярынец. Люблю Беларусь: 200 феноменаў нацыянальнай ідэі. — Вільня: Інстытут беларусістыкі, 2008 (Кнігарня «Наша Ніва»).**

Калі ў вас яшчэ няма дзетак, іх варта завесці хаця б для таго, каб было каму чытаць перад сном новую, шостую (!) кнігу Паўла Севярынца. Цяжка вызначыць жанр гэтай 600-старонкавай масіўнай працы, пакуль не скажаш сабе: падручнік. У далёкім дзяцінстве ў мяне была выдадзеная на кепскай паперы брашура «100 пытанняў і адказаў па Гісторыі Беларусі». Яна несла не так шмат інфармацыі, але затое моцна, у адзін прысест, перапраўляла свядомасць. Так я і даведалася, хто вашы, а хто — нашы. Прыкладна для гэткіх жа мэтаў можа служыць грунтоўная праца свежага светача кансерватыўнай беларускай думкі, прэзентаваная 12 снежня на сядзібе Беларускага ПЭН-цэнтру.




«Люблю Беларусь» — вельмі прыгожая кніга, і справа не толькі ў дызайне. Ствараючы фенаменалогію Беларускай Ідэі, Севярынец часта грашыць як супраць гістарычнай праўды, так і супраць звычайнай логікі. Але ў гэтых пагрэшнасцях і палягае прыгажосць. Бо гісторыя чалавецтва — гэта не тое, што было насамрэч, а тое, як гэта канцэптуалізавалі пазнейшыя эпохі. Першае месца ў маім сэрцы — Паўлава спроба канцэптуалізацыі пергідролі: «Сённяшнія беларусачкі фарбуюцца пасвятлей, дзеля таго, каб вярнуцца да першапачатковага — белага-белага вобразу».

Калі ж адкінуць усе ідэалагічныя штучкі, «аўтарская энцыклапедыя» Паўла Севярынца чытаецца нагбом, як байранічная паэма. Дарэчы, у кнізе фігуруе нават самы сапраўдны верш аўтарства Паўла Севярынца! Кніга сатканая з пастулатаў, лозунгаў, а то і наўпрост — рэкламных слоганаў беларускай ідэі, некаторыя з якіх паводле сваёй паэтычнасці нагадваюць мадэрністычны жанр монавершу-грэгерыі: «Беларускі ручнік — маленькі бел-чорвона-белы сцяг»; «Камароўскі кірмаш — чэрава Мінску». Зараз паспрабую сфармуляваць у гэтым стылі… Вось! Павал Севярынец — беларускі Леанід Парфёнаў.

Севярынец празмерна сакралізуе Беларусь. Чаго толькі вартыя пасажы «Галоўная беларуская асоба — Ісус Хрыстос» ці «Храм — эпіцэнтр беларускай нацыянальнай ідэі», «Беларусь — гэта духовая рэальнасць» і многія-многія іншыя. Тым самым ён становіцца на хісткі масток месіянства, пад знакам якога адраджалася ў XIX — пачатку XX стагоддзя польская дзяржаўнасць. Хісткі, бо атаясамленне роднай краіны з цэлым укрыжаванага Ісуса як спроба абуджэння нацыянальнай свядомасці — прыём састарэлы на цэлае стагоддзе. Зрэшты, мы не маем нічога супраць — калі Паўлу так прыемней. Усё, што ён робіць і піша, апраўдвае адна важная рэч: ён і сапраўды любіць Беларусь. І ці не ўпершыню ў беларускай літаратуры ў яго працы яна ўцелаўляецца не ў вобраз жанчыны-маці, а ў вобраз дзяўчыны-нявесты, па ўзнёсласці і недасяжнасці блізкай да Петраркавай Лауры і Дантавай Беатрычэ. І крыху сумна робіцца ад таго, што, насуперак слыннаму паролю Кастуся Каліноўскага, але проста як у італьянцаў з іх музамі, у Беларусі з Севярынцам не ўзаемна.

На паліцы ў рэдакцыі «НЧ» цяпер ёсць кніга «Люблю Беларусь» з аўтографам аўтара, да якога прыпісана: «Яна 3:16». Нам удалося дэшыфраваць пасланне: «Бог так палюбіў свет, што аддаў Сына Свайго Адзінароднага, каб кожны, хто верыць у Яго, не загінуў, а меў жыццё вечнае».

## АФІША

### ПРЫСВЯЧЭННЕ ВЕЧНАМУ ВАНДРОЎНІКУ

**10 снежня з нагоды 120 гадовага юбілею Язэпа Драздовіча ў Палацы мастацтваў адкрылася выстава «Вечны вандроўнік» у гонар славутага беларускага паэта, фалькларыста і мастака.**

Па словах прафесара Арсеня Ліса, назва яго кнігі пра Язэпа Драздовіча, якая лічыцца найбольш падрабязнай і адной з першых манаграфій пра мастака — «Вечны вандроўнік», — зрабілася другім імем выдатнага творцы.

«Першасным у таленце Драздовіча з'яўляецца элемент універсальнасці. Ён і мастак, і графік, і скульптар, і літаратар, і навуковец. Прычым якраз свае касмічныя даследаванні, як і белетрыстыку, Драздовіч лічыў вельмі сур'ёзнымі. З самага пачатку ён быў свядомым рэалізатарам беларускай ідэі: варта прыгадаць яго ранняе супрацоўніцтва з «Нашай нівай» і выкананы ім па заказе Янкі Купалы малюнак для вокладкі кнігі вершаў Канстанцыі Буйло «Курганная кветка». А Вацлаў Ластоўскі папрасіў яго аформіць першае выданне беларускага календара-кнігі. Служэнне беларускасці Драздовіч пранёс праз усё жыццё і амаль беспасрэдна перадаў гэтую паходню новай генерацыі адраджэнцаў, такіх, як Кулік, Купава, Марачкін, Шатэрнік і многія іншыя» — зазначыў прафесар Ліс.

Арганізатарамі выставы выступіла творчая суполка «Пагоня» Беларускага саюзу мастакоў у межах кампаніі «Будзьма».

### ПАМЯЦІ ДУНІНА-МАРЦІНКЕВІЧА

**Таксама 10 снежня ў суседняй зале Палаца мастацтва адчынілася экспазіцыя ў гонар 200-годдзя з дня нараджэння Вінцэнта Якуба Дуніна-Марцінкевіча.**



Выстава пачалася з музыкі: трыо «Вытокі» выканала кампазіцыі, якія зазвычай гучалі ў салонах беларускай шляхты ў XIX стагоддзі. Спяваў Віктар Скарабагатаў. Малады фагатыст ансамбля «Класік-авангард», але ўжо вядомы музыказнаўца Аляксей Фралоў распавёў, як з праграмы «Адраджэнне беларускай капэлы» пачыналася вяртанне слухачам тых музычных твораў, без якіх зараз цяжка ўявіць сучасную беларускую і еўрапейскую сцэну — сачыненняў Манюшкі, Міхала Клеафаса Агінскага і іншых вядомых кампазітараў.

Адзін з кіраўнікоў Беларускага саюза мастакоў, графік Рыгор Сітніца, звяртаючыся да гасцей прэзентацыі, падкрэсліў значнасць асобы Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча як пачынальніка беларускай літаратуры і свецкай культуры.

### «ДЭБЮТ–2008»

**А верхні паверх Палаца мастацтваў заняла экспазіцыя пад назвай «Дэбют–2008», падрыхтаваная мастацтвазнаўцам і куратарам імпрэзы Ларысай Фінкельштэйн.**

У ёй прадстаўлены лепшыя працы 73 мастакоў, у тым ліку выпускнікоў вышэйшых мастацкіх навучальных установ краіны, якія нядаўна былі прынятыя ў моладзевую секцыю БСМ. На выставе дэманструюцца творы жывапісу, графікі, скульптуры і дэкаратыўна-ўжытковага мастацтва. Як заўважыў на адкрыцці намеснік старшыні БСМ па выставачнай дзейнасці Сяргей Цімохаў, экспануемыя работы вызначаюцца ўласцівым для маладога пакалення імкненнем да творчага пошуку, але адначасова прадстаўніча рэпрэзентуюць стылёвую разнастайнасць і сучасны стан беларускай мастацкай культуры.

Мінская фірма «Палітра» выставіла на адкрыцці стэнды фарбаў і мастацкіх прылад, а таксама два палотны. Мастакі-ўдзельнікі вернісажу пакінулі на іх свае мазкі, а калектыўныя работы, якія атрымаліся ў выніку такога акту сутворчасці, будуць перададзены ў падарунак адной з мінскіх дзіцячых клінік.

Усе выставы працуюць з 10 па 21 снежня ўключна.

**Падрыхтаваў Аляксей Хадыка**

МУЗЫКА

# СУМНАЯ ГІСТОРЫЯ НЯСВІЖА Ў ПАРТРЭТАХ

*Аляксей ХАДЫКА*

**8 снежня ў Нацыянальным мастацкім музеі пад акампанемент ансамбля «Харошкі» і ў суправаджэнні тэатралізаванага шоу рыцарскага клуба «Мінская харугва» адбылося адкрыццё экспазіцыі гістарычнага партрэта Беларусі XVI–XIX стагоддзяў.**

На агляд публікі прапанавана 47 твораў са сталай калекцыі, прычым 23 экспанаты вельмі рэдка пакідалі фондасховішчы. Выдатная якасць гэтых твораў цалкам суадносіцца з еўрапейскім узроўнем адкрытай пару год таму новай часткі Нацыянальнага мастацкага музея. Прадстаўнікі ўладальнікаў Нясвіжскага замка, з якога паходзяць партрэты, буйнейшага беларускага магнацкага роду Радзівілаў, стагоддзямі запрашалі да сябе лепшых мастакоў і збіралі шэдэўры сусветнай мастацкай культуры. На палотнах партрэты — Лізаветы Сцюарт пэндзля Маркуса Герартса, дачкі караля Англіі Якаба I Сцюарта (дар віленскаму кашталяну Янушу Радзівілу), Марыі Казіміры Сабескай, жонкі Яна III Сабескага, самога Януша Радзівіла работы Барталамея Стробеля і многіх іншых гістарычных асоб.

Выступаючы на адкрыцці выставы, старшыня Нацыянальнай камісіі Беларусі па справах ЮНЭСКА Уладзімір Шчасны сказаў, што экспазіцыя гістарычнага партрэта магла б стаць сапраўдным упрыгажэннем адноўленага замка ў Нясвіжы. І дадаў, што ў замку з цягам часу будзе размешчаны рэканструяваны фамільны архіў Радзівілаў — 138 тысяч копій дакументаў, раскіданых зараз па фондасховішчах розных краін. А таксама 48 лічбавых каляровых копій, нанесеных на палатно, зробленых з сямейных партрэтаў нясвіжскіх магнатаў, арыгіналы якіх захоўваюцца ў музеях Польшчы.

Але, на жаль, не ўсё так аптымістычна ў справе музеефікацыі аднаго з найпрыгажэйшых замкаў Беларусі. Мы ўжо пісалі пра варварскі ўзровень рэстаўрацыі, якую ажыццяўляюць беларускія спецыялісты на чале з С. Друшчыцам. На галоўную вежу замка пасля пажару падчас рэстаўрацыі (!) змешчана адвольнае, абсалютна выпадковай формы вельмі цяжкае навершша, якое руйнуе будынак сваім цяжарам. Збіваючы гістарычную тынкоўку, якая добра трымалася, і замяняючы яе на новую, рэстаўратары ўхітрыліся давесці сцэны да аварыйнага стану. У выніку давя-






лося разабраць адно з крылаў пабудовы, замяняючы арыгінальныя муры на навадзел-муляж.

Цудам захаваны аўтэнтычны ансамбль можа ператварыцца ў музеефікаваную копію. Гэта датычыцца таксама згаданых «лічбавых» копій партрэтаў. Сярод неспецыялістаў мала хто ведае, што ў 1950 годзе, у выніку намаганняў польскага боку і паводле рашэння Савета Міністраў №820–102 ад 5 ліпеня 1950 г., у Польшчу з Беларусі было перададзена 89 твораў мастацтва, уключаючы арыгіналы 48 партрэтаў Радзівілаў. Тых самых, копіі з якіх зараз можа атрымаць Беларусь. Як прыгадвала тагачасная дырэктарка Мастацкага музея Алена Аладава, зроблена гэта было спецыяльна ў час яе адсутнасці ў Мінску, паводле настойлівай рэкамендацыі з Масквы — заахвоціць новага сацыялістычнага сябра СССР — ПНР. І паводле просьбы палякаў, якія скарысталі сітуацыю.

У 90-я гады, з аднаўленнем незалежнасці, дзякуючы дзейнасці сумеснай беларуска-польскай камісіі ў галіне культуры была дасягнута дамоўленасць пра вяртанне арыгіналаў забраных твораў — пры ўмове музеефікацыі замка ў Нясвіжы — на іх гістарычнае месца. Заўважым, што такіх «перамешчаных» з Беларусі мастацкіх каштоўнасцяў — не 89. Іх сотні і сотні. Знаходзяцца яны і ў Польшчы, і ў Расіі, і ў іншых краінах. А перамяшчаліся яны часам розных захопаў нашых земляў — Расіян у XVIII–XX стагоддзях, палякамі і немцамі ў XX стагоддзі. Перамяшчаліся яны паводле несправядлівага Рыжскага міру 1921 года паміж СССР і Польшчай, і шмат якіх іншых дамоўленасцяў.

Адзін з самых вядомых беларускіх гісторыкаў культуры Адам Мальдзіс, калі выступаў 8 снежня на адкрыцці экспазіцыі партрэтаў у мастацкім музеі, сказаў: «Пажар у Нясвіжскім замку і разбурэнне адной з яго галерэй рэстаўратарамі ператварыў гістарычны замак у хутар». З навукоўцам можна пагадзіцца — у Нясвіжы павінна працаваць не правінцыйная, а «еўрапейская каманда», якая ведае мовы, дакументы, гісторыю культуры і найноўшыя тэхналогіі ў галіне аховы і рэстаўрацыі помнікаў. А Савету Міністраў, які калісьці ў 1950 годзе падараваў мастацкія творы з інтэр'ераў замка ў суседнюю краіну, варта было б на сваім узроўні паклапаціцца пра іх вяртанне, не спіхваючы справу на ўзровень беларуска-польскай камісіі і тым больш самога музея. Музей — толькі адна з інстытуцыяў дзяржавы, вельмі важная, але не такая прадстаўнічая, як урад. Можа, хоць партрэты ў інтэр'ерах замка будуць арыгіналамі, а не муляжамі?

Пакуль жа беларускія чыноўнікі ад культуры дзейнічаюць, як ім прасцей: польскі бок задаволены, бо непраўдзіва набытыя культурныя каштоўнасці застаюцца ўзбагачаць менавіта іх краіну. Нібыта вытрыманы і правілы прыстойнасці: хоць копіі, але нешта вяртаецца на радзіму. Народ, маўляў, не разбярэцца, што атрымаў махлярскую «лялькю». А чыноўнікам — і магчымасць паглядзець арыгінальныя твораў у Варшаве ды Небарове (калі раптам захочацца), і камандзіроўкі з добрымі кішэннымі грашыма, і прыёмы, кампліменты, фуршэты і прагулкі ў Лазенках ад польскіх сяброў. Спецыялісты ў такіх камісіях па абмене і рэстаўрацыі важных культурных аб'ектаў у сучаснай беларускай дзяржаве працуюць вельмі рэдка. Навошта спецыялісты?

Новы Час
Масава-палітычная газета
Выдаецца з сакавіка 2002 г.
Галоўны рэдактар **Алена Анісім**
Шэф-рэдактар **Аляксей Кароль**

Пасведчанне аб рэгістрацыі № 1798 ад 12 верасня 2008.
**ЗАСНАВАЛЬНІК:** Мінская гарадская арганізацыя ГА ТБМ імя Ф.Скарыны. Адрас: 220005, г. Мінск, вул. Румянцава, 13. Тэл.: 284–85–11.
**ВЫДАВЕЦ:** Прыватнае выдавецкае унітарнае прадпрыемства «Час навінаў».

Пасведчанне №64 ад 12.01.2007 г.
**АДРАС РЭДАКЦЫІ І ВЫДАЎЦА:**
220012, г. Мінск, зав. Інструментальны, 6-214.
Тэл.: +375 29 651 21 12, +375 17 280 17 91.
chasnavinau@gmail.com; http://kamunikat.org/novy_chas.html
**НАДРУКАВАНА** ў друкарні УП «Плутас-Маркет».
Мінск, вул. Халмагорская, 59 А.

Замова №
Падпісана да друку 19.12.2008. 8.00.
Наклад 5050 асобнікаў. Кошт свабодны.
Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы дзеля палемікі, не падзяляючы пазіцыі аўтараў.
Пры выкарыстанні матэрыялаў газеты спасылка на «Новы Час» абавязковая.
Рукапісы рэдакцыя не вяртае і не рэцэнзуе мастацкія творы.
Чытацкая пошта публікуецца паводле рэдакцыйных меркаванняў.